

ЯК ВАША СЛОВА АДГУКНЕЦЦА 5

«ЛІСТАПАД»: ГІСТОРЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА 13



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЛІСТАПАДА 2021 г. СУБОТА № 225 (29594)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга ГЕРМАН, начальнік аддзела юрыдычнай работы і кадраў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Рынак арэнднага жылля сёння актыўна развіваецца: на яго прыпадае больш за 8 млн кв. м, што складае больш за 50 % ад усяго дзяржжаўнага жыллёвага фонду. Можна канстатаваць станоўчы эфект ад стварэння фонду дзяржаўнага арэнднага жылля, які не толькі забяспечыў альтэрнатыву прыватнаму фонду, але і стаў дадатковай крыніцай, за кошт якой робіцца ўзнаўленне і рамонт ужо наяўнага ў краіне жылля. Да 40 % ад агульнай колькасці незаселенага фонду даецца грамадзянам, якія маюць першачарговае права на атрыманне ў сувязі з характарам працоўных, службовых адносін. Гэта маладыя спецыялісты, маладыя рабочыя, якія атрымалі адукацыю за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, работнікі культуры ды іншыя асобы».*

# Зямлі надзейная апора

***Работнікам і ветэранам сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу***

*Дарагія сябры!*

*Прыміце самыя шчырыя віншаванні з прафесійным святам.*

*Ваша стваральная любоў да роднай зямлі і нялёгкай сялянскай працы забяспечвае харчовую бяспеку Беларусі, а таксама дазваляе займаць высокія пазіцыі на найбуйнейшых міжнародных рынках.*

*Сёлета вы зноў даказалі: наша краіна — надзейны партнёр, здольны нават у самых няпростых умовах нарошчваць экспартныя пастаўкі, захоўваючы найвышэйшую якасць прадукцыі, выраблены пад брэндам «Зроблена ў Беларусі».*

*Дзякую за тое, што вашымі вялізнымі намаганнямі рэспубліка славіцца ў свеце як радзіма малочных рэк, ураджайных палёў, сучасных ферм, а галоўнае — выдатных працавітых людзей.*

*Перакананы, што і ў далейшым, абапіраючыся на найбагацейшыя традыцыі, айчынны аграпрамысловы комплекс будзе расці і развівацца, убіраючы ў сябе ўсё самае лепшае і перадавое.*

*У гэты святочны дзень жадаю кожнаму з вас моцнага здароўя, упэўненасці ў заўтрашнім дні і новых поспехаў на карысць Беларусі і яе народа.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Сямейнае свята



Вядомае сельгаспрадпрыемства сталічнага раёна — «Гастэлаўскае» — да свайго прафесійнага свята падышло з высокімі паказчыкамі. На селётнім жніве гаспадарка выйшла на ганаровае першае месца, атрымаўшы з ворыўнага гектара дзевяноста восем цэнтнераў зерневых. Парадавалі «гастэлаўцаў» і іншыя традыцыйныя культуры: бульба ўрадзіла на 576 цэнтнераў, цукровыя буракі далі пад 700 цэнтнераў з гектара. Найлепшымі паказчыкамі завяршаюць вытворчы год і жывёлаводы — валавы надой малака за дзесяць месяцаў склаў болей чым 16 тысяч тон.

У гаспадарцы працуюць 237 чалавек, сярод іх і дынастыі, і сямейныя пары, як напрыклад, сужэнцы Андрэй ЛЕУ і Анжаліка ВІЦЕБСКАЯ *(яны на гэтым фота)*. Андрэй Васільевіч — механізатар шырокага профілю, апрацоўвае глебу, сее, кіруе камбайнам на жніве, убірае кукурузу. Перадавік, адказны і надзейны работнік. Анжаліка Міхайлаўна — вядучы юрысконсульт, сакратар назіральнага савета прадпрыемства, акрамя таго, яна актыўная ўдзельніца грамадскага жыцця калектыву. А свята працаўнікоў сельскай гаспадаркі Андрэй і Анжаліка будуць адзначаць у «Гастэлаўскім» ужо пяты раз.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **БРСМ заснаваў спецыяльную прэмію «Гуманітарныя валанцёры Беларусі».**
- Нацсавет па працоўных і сацыяльных пытаннях прапанаваў устанавіць з 1 студзеня МЗП у памеры Br457.
- **ФПБ прапануе аплачваць бюджэтнікам дадатковы водпуск па сямейна-бытавых прычынах.**
- У Мінску радзільны дом № 2 з 29 лістапада вернецца да профільнай дзейнасці.

ISSN 1990 — 763X

21225

# НЕ ДОМА.
## АЛЕ СЦЕНЫ ПАМАГАЮЦЬ

***Учора Прэзідэнт дaручыў узмацніць меры бяспекі ў лагістычным цэнтры на граніцы з Польшчай, дзе размяшчаюцца бежанцы. Найперш размова ідзе аб пажарнай бяспецы, але і міліцыя, і пагранічнікі заклікaны кантраляваць бяспеку лагера ў цэлым. Звычайны жыццёвы клопат пра людзей, якія ў вялікай колькасці знаходзяцца ў адным, няхай сабе і прасторным, памяшканні.***

***Гэтым звычайным чалавечым клопатам пра жывых людзей, гэткіх самых, як і мы з вамі, прадыктавана і рашэнне даць ім дах над галавой, каб не замярзалі на мокрай зямлі. Забяспечыць ім элементарныя ўмовы побыту, няхай сабе і ў такіх паходных умовах. Прывезці ім коўдры, каб было чым накрыць дзяцей, накарміць іх гарачым, даць магчымасць зарадзіць тэлефоны. Нікому не адмаўляюць у медыцынскай дапамозе, разгорнуты нават пункт вакцынацыі ад ковіду. Прыехала аўтакрама і нават крама з шаўрмой. Дзеці сталі часцей усміхацца, чым плакаць.***

***Зразумела, што ўсё гэта ненадоўга (яно і не павінна быць надоўга ні па законах чалавечнасці, ні па нормах міжнароднага права). Крызіс вырашыцца: нездарма ж для гэтага прыкладаюцца намаганні на самым высокім узроўні. Беларусь для гэтых людзей стане адным з пунктаў іх падарожжа да мэты, ад якой яны не адмаўляюцца і цяпер. Хочацца верыць, што наша краіна будзе ў іх асацыіравацца менавіта са словам «клопат». Пра тое, што мы самі годна выходзім з гэтай сітуацыі, што нам самім не будзе сорамна, можна сказаць ужо дакладна.***



Фота БелТА.

# Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю брытанскай тэлекампаніі ВВС

**Размаўляў з Прэзідэнтам Беларусі вядучы міжнародны аглядальнік тэлекампаніі ВВС у Расіі Стывен Розэнберг.**

Журналіст спецыялізуецца на тэматыцы постсавецкай прасторы. Дарэчы, здымачная група канала ўжо не першы дзень працуе ў Беларусі і ў тым ліку на граніцы, куды беларускі бок дапусціў усе СМІ, уключаючы замежныя, для асвятлення сітуацыі з бежанцамі. Пры гэтым суседняя Польшча, як вядома, прадаўжае прытрымлівацца палітыкі поўнай інфармацыйнай блакады.

У ліку шматлікіх замежных СМІ «Бі-бі-сі» звярнулася з просьбай аб інтэрв'ю кіраўніка беларускай дзяржавы, і здымачная група была запрошана ў Палац Незалежнасці.

Інтэрв'ю з Аляксандрам Лукашэнкам цягнулася больш за гадзіну. Беларускі лідар традыцыйна быў гатовы адказаць на ўсе пытанні. У цэлым размова ў першую чаргу датычылася сітуацыі на беларуска-польскай граніцы, цікавілі брытанскіх журналістаў і падрабязнасці размовы кіраўніка дзяржавы з в. а. канцлера Германіі Ангелай Меркель, узаемаадносіны Беларусі з Еўрасаюзам і Расіяй. Варта заўважыць, што журналіст задаваў у асноўным пытанні, якія раней не раз гучалі ад яго калег з іншых заходніх СМІ і на якія Аляксандр Лукашэнка ўжо даваў вычарпальныя адказы. Тым не менш Прэзідэнт чарговы раз адказаў на ўсе пытанні, у тым ліку і на тыя, якія ўтрымлівалі скажоную інфармацыю і яўныя фэйкі.

Маркуецца, што відэаверсія з'явіцца на рэсурсах ВВС на працягу некалькіх дзён.

Прэзідэнт Беларусі запрасіў прадстаўнікоў тэлекампаніі ВВС на яшчэ адну размову — у прамым эфіры, каб гледачы змаглі без мантажу пачуць усе адказы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

* * *

Акрамя таго, учора адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі з Прэзідэнтам Расіі. Лідары краін абмеркавалі развіццё двухбаковых адносін, паведамляе БелТА.

Сярод актуальных тэм гэтым разам — рэалізацыя 28 саюзных праграм, сітуацыя ў цэлым у Беларусі і Расіі. Таксама Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў Уладзіміра Пуціна аб становішчы на граніцы Беларусі з краінамі Еўрасаюза.

# БЕЛАРУСЫ ДЭМАНСТРУЮЦЬ СВАЕ САМЫЯ ЛЕПШЫЯ ЯКАСЦІ ЎСЯМУ СВЕТУ

## Пра гэта заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка падчас наведвання Магілёўскай вобласці

**Ігар СЕРГЕЕНКА ўзяў удзел у фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2021», які ў пятніцу-суботу праводзіцца ў Магілёве. Разам з намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандрам Субоцінам, міністрамі, старшынёй аблвыканкама Леанідам Зайцам, іншымі прадстаўнікамі выканаўчай улады, парламента ён агледзеў хлебасольныя падворкі ад кожнага раёна, азнаёміўся з выстаўкай дасягненняў навучальных устаноў, прадпрыемстваў перапрацоўчай галіны. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта ўзнагародзіў перадавікоў сёлетняй уборачнай.**



У размове з журналістамі Ігар Сергеенка адказаў на надзённыя пытанні, якія хвалююць жыхароў краіны. Адно з галоўных — падзеі на беларуска-польскай граніцы. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што Беларусь дапамагае людзям, якія трапілі ў бяду. Забяспечвае харчаваннем, усім неабходным, аказвае медыцынскую дапамогу.

— Сітуацыя на граніцы няпростая, але яна знаходзіцца пад поўным кантролем кіраўніцтва краіны, — адзначыў ён. — Прадстаўнікі калектыўнага Захаду спрабуюць нас абвінаваціць у арганізацыі міграцыйнага крызісу. Але гэта не так. Сёння сродкі масавай інфармацыі цытавалі словы дзяржсакратара ААН наконт таго, што Беларусь не з'яўляецца першапрычынай сітуацыі, якая склалася на граніцы. Людзі бягуць ад вайны, да лепшага, беспраблемнага, на іх погляд, жыцця, туды, куды іх паклікалі.

Ігар Сергеенка звярнуў увагу, што Беларусь сёння працуе таксама па ўрэгуляванні праблемы з бежанцамі, спрабуе даводзіць інфармацыю на ўсіх міжнародных пляцоўках.

— На жаль, пакуль вынікаў няма, — канстатаваў выступоўца. — Прадстаўнікі ўзброеных сіл Польшчы вядуць сябе агрэсіўна ў адносінах да мірных людзей, прымяняюць сілу, слёзатачывы газ, вадамёты. Не сумняваюся, што шляхі вырашэння гэтай праблемы будуць знойдзены, але цяжка сказаць, калі. Праблема з бежанцамі нарадзілася не ўчора, таму наш доўг — дапамагаць тым, хто трапіў у бяду. І беларусы праявілі ў гэтай сітуацыі свае найлепшыя чалавечыя якасці.

Ігар Сергеенка таксама адказаў на пытанні, якія датычацца работы над Канстытуцыяй. Месяц таму ён узначаліў групу, што была створана па распараджэнні Прэзідэнта.

— Асноўныя нашы задачы — сфарміраваць канчатковую канфігурацыю праекта Канстытуцыі, — сказаў ён. — За гэты перыяд было праведзена шэсць пасяджэнняў працоўнай групы, адбылося некалькі сустрэч з Прэзідэнтам, дзе абмяркоўваліся канкрэтныя падыходы па канкрэтных артыкулах Асноўнага Закона. На сёння мы сфарміравалі адзіны падыход, адпрацавалі фармулёўкі.

Змяненні прапаноўваюцца ў 77 артыкулаў Канстытуцыі, у прэамбуле плануецца ўвесці дадатковую главу, якая будзе даваць характарыстыку паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу. Акрамя гэтага, будуць уводзіцца 10 новых артыкулаў Канстытуцыі. Два артыкулы прапаноўваецца выключыць.

— Калі казаць тэзісна, самыя сур'ёзныя змяненні — гэта паўнамоцтвы, статус, парадак фарміравання Усебеларускага народнага сходу, — заявіў Ігар Сергеенка. — Гэта найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладства, своеасаблівае народнае веча. Рашэнні Усебеларускага народнага сходу будуць абавязковыя для выканання. У яго, напрыклад, будзе права прымаць рашэнні па пытаннях, якія супярэчаць інтарэсам нацыянальнай бяспекі.

Напярэдадні свята работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці, якое краіна адзначае ў трэцюю нядзелю лістапада, Ігар Сергеенка павіншаваў прадстаўнікоў галіны, падзякаваў ім за працу, пажадаў здароўя і бадзёрасці.

— Свята адзначаюць 325 тысяч чалавек, якія працуюць у гэтай галіне, і ў цэлым уся краіна, — падсумаваў ён. — Наш аграпрамысловы комплекс на працягу апошніх гадоў дэманструе поспехі, забяспечвае харчовую бяспеку краіны і пастаўляе тавар на экспарт. Па ўзроўні харчовай бяспекі летась Беларусь займала 23-е месца сярод 113 краін. Вынікі гэтага года яшчэ не падведзеныя. Наша краіна ўваходзіць у пяцёрку сусветных вытворцаў малочнай прадукцыі, займае 9-е месца па вытворчасці ялавічыны, 12-е — па вытворчасці курацiны. Гэта рэальныя дасягненні, калі параўноўваць лічбы сённяшнія з тымі, якімі яны былі ў 90-я гады. Нам яшчэ шмат над чым трэба працаваць. Сёння ў сельскую гаспадарку прыходзяць высокія тэхналогіі, высокавытворчая тэхніка, але галоўнае месца па-ранейшаму займае працаўнік.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

## Акцэнты

# МІГРАЦЫЙНЫ КРЫЗІС НА ГРАНІЦЫ БЕЛАРУСІ І ЕЎРАСАЮЗА — АДЗІН З ПРЫЁМАЎ ВАРШАВЫ ПА ШАНТАЖЫ БРУСЕЛЯ

**Лічыць старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ:**



— Як вядома, Еўрапейскі саюз у сваім цяперашнім выглядзе ўяўляе сабой вельмі неаднастайнае і адпаведна нестабільнае міжнароднае ўтварэнне, вымушанае з мэтай захавання ладу ўяўнага адзінства праводзіць сярод сваіх членаў палітыку кампрамісаў і недамоўленасцяў, — перакананы сенатар.

У якасці яскравага прыкладу гэтага сцвярджэння ён прыводзіць маштабны міграцыйны крызіс, які накрыў ЕС яшчэ ў 2014—2015 гадах і з'явіўся вынікам дэстабілізацыі шэрагу дзяржаў Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі ў выніку развязвання ў дачыненні да гэтых краін ЗША і іх хаўруснікаў «каляровых рэвалюцый», вайсковых канфліктаў і грамадзянскіх войнаў.

— Прычым маштаб гэтага крызісу ў шмат разоў перакрыў па сваім эфекце іншыя праблемы Еўрасаюза: брэксіт, доўг Грэцыі і іншыя, — звяртае ўвагу Сяргей Сівец. — І калі ў пачатку гэтай крызіснай з'явы палітыка Еўракамісіі будавалася на абсалютным выключэнні якіх бы там ні было забаронных мер у адносінах да мігрантаў і бежанцаў і строгім захаванні прынцыпаў і нормаў міжнароднага гуманітарнага права, то ў далейшым пад ціскам так званых маладых членаў ЕС — балканскіх краін і Вышаградскай чацвёркі — гаворка ўжо ішла аб неабходнасці вядзення палітыкі «кіраванай» міграцыі за кошт размеркавання квот па прыёме бежанцаў сярод краін – членаў Еўрасаюза.

Парламентарый нагадаў, што механізм і парадак размеркавання гэтых квот разглядаўся і тады, і цяпер шэрагам краін ЕС, у першую чаргу Польшчай, не як інструмент салідарнасці і гуманізму ў дачыненні да людзей, якія апынуліся ў бядзе і маюць патрэбу ў дапамозе, а як спосаб шантажу і вымагальніцтва дадатковых ільгот і фінансавых прэферэнцый пры размеркаванні «агульнага бюджэтнага пірагу» Еўрасаюза.

— Менавіта Польшча ў 2015 годзе ў фармаце Вышаградскай групы больш актыўна выступала і агітавала супраць прынцыпу механізму абавязковага і пастаяннага размеркавання бежанцаў, рэкрутаваўшы для гэтага пад свае сцягі Чэхію, Славакію і Венгрыю, але ў апошні момант перад галасаваннем на саміце ЕС у гэтым пытанні «перакулілася ў паветры» пасля атрымання гарантый ад Еўракамісіі аб шматмільярдных уліваннях у польскі бюджэт, — акцэнтуе ўвагу суразмоўнік.

Ён лічыць, што гуманітарная катастрофа з бежанцамі на беларуска-польскай граніцы, якая разгортваецца на нашых вачах, выклікае ўстойлівае адчуванне дэжавю адносна міграцыйнай палітыкі і паводзін Польшчы ў 2015 годзе.

— Ні для кога не сакрэт, што палітыка, якая праводзіцца цяперашнімі польскімі ўладамі, выклікала востры палітычны крызіс і супрацьстаянне ўнутры Еўрасаюза, а, па сутнасці, паставіла на карту яго цэласнасць і адзінства, — тлумачыць старшыня профільнай камісіі. — Рашэнне Канстытуцыйнага Суда Польшчы аб прызнанні вяршэнства нацыянальнай Канстытуцыі над законамі Еўрасаюза з'яўляецца ні чым іншым, як палітычным і прававым сепаратызмам і ідзе насуперак з устаноўчымі актамі Еўрасаюза.

Нагадвае ён і аб выніках гэтага кроку — Польшча ўжо падвергнутая Еўракамісіяй сур'ёзным фінансавым санкцыям, і ў далейшым ёй можа быць цалкам заблакіраваны доступ да бюджэту Еўрасаюза.

— У сувязі з гэтым штучнае інспіраванне вострага міграцыйнага крызісу на знешніх граніцах Еўрасаюза пад уяўнымі лозунгамі бяспекі і працідзеяння пранікненню на яго тэрыторыю тэрарыстаў пад выглядам бежанцаў з'яўляецца ні чым іншым, як чарговым амаральным спосабам польскіх улад дасягнуць сваіх меркантыльных і палітычных мэт, — перакананы Сяргей Сівец. — Вось толькі ў якасці разменнай карты ў гэтай палітычнай авантуры польскіх гора-кіраўнікоў выступаюць жыццё і здароўе тысяч ні ў чым не вінаватых мужчын, жанчын і дзяцей, якія міжволі сталі заложнікамі геапалітычных разборак краін Еўрасаюза, куды іх у свой час урачыста запрасілі і куды яны які ўжо дзень спрабуюць беспаспяхова трапіць.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Кантэкст

# СЫВАРАТКА ПРАЎДЫ

**Агрэсіўнасць не мае апраўданняў. Такую ацэнку дзеянням польскіх сілавікоў на беларуска-польскай граніцы даў намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый Міцкевіч. Паводле яго слоў, Беларусь не магла зрабіць інакш, як працягнуць руку дапамогі бежанцам, паведаміла БелТА. «Зразумела, мы праявілі міралюбнасць і гуманнасць. Вы бачылі, што нашы людзі абагрэлі, накармілі бежанцаў і ў прынцыпе паставіліся да іх па-людску, вельмі гуманна. Зрэшты, гэта ндзвычайна, таму што такі беларускі народ», — адзначыў віцэ-спікер.**

## ЦЁМНЫ БОК ЕЎРОПЫ

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей у інтэрв'ю CNN заявіў пра абсурднасць абвінавачанняў у адрас Беларусі ў сувязі з сітуацыяй на беларуска-польскай граніцы. Аб гэтым паведамілі БелТА ў беларускім знешнепалітычным ведамстве. У інтэрв'ю амерыканскай тэлекампаніі Уладзімір Макей абверг абвінавачанні ў адрас Беларусі ў стварэнні міграцыйнага крызісу на граніцы з ЕС, назваўшы іх «у корані няправільнай ацэнкай сітуацыі». «Гэта драматычная сітуацыя. Паводле нашых даных, сярод бежанцаў знаходзяцца больш як 600 жанчын і 200 дзяцей. І назіраць за тым, як яны пакутуюць, складана любому нармальнаму чалавеку. Мы не зацікаўлены ў такой сітуацыі тут, у Беларусі», — падкрэсліў міністр.

Уладзімір Макей падкрэсліў адказнасць Еўрапейскага саюза за сітуацыю на граніцы. Ён адзначыў, што мігранты, пачуўшы пра абяцаныя суседнімі з Беларуссю краінамі ЕС прывілеі «мігрантам з Беларусі», вырашылі, што краіна з'яўляецца для іх найбольш камфортным спосабам трапіць у Еўропу. «На прыкладзе Беларусі праявіўся цёмны бок еўрапейскай дэмакратыі. Вы бачылі на ўласныя вочы, што адбылося на граніцы за апошнія некалькі дзён», — падкрэсліў міністр. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства таксама адхіліў абвінавачанні ў адрас Расіі аб магчымай датычнасці да сітуацыі з бежанцамі на граніцы Беларусі з Еўрапейскім саюзам.

## ПАЗІЦЫЯ ГЕНСЕКА ААН

Тым часам стала вядома, што генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш згадзіўся з тым, што Беларусь не з'яўляецца ні крыніцай, ні прычынай патокаў бежанцаў. Аб этым было заяўлена на праведзенай сустрэчы ў Нью-Ёрку з пастаянным прадстаўніком Беларусі пры ААН Валянцінам Рыбаковым, паведаміла БелТА. «Ён падкрэсліў, што добра ведае сітуацыю, пры якой мігранты, што накіроўваюцца ў Заходнюю Еўропу, катэгарычна не разглядаюць транзітныя краіны ў якасці мэты свайго падарожжа. Зразумела, не жадаючы спыніцца ў гэтым канкрэтным выпадку ў Беларусі, ні нават у Польшчы. Ні тым больш у Літве. Іх адзіная мэта — трапіць нейкім чынам у першую чаргу ў Германію. І ён з гэтай сітуацыяй асабіста не раз сутыкаўся на сваёй папярэдняй пасадзе (раней Антоніу Гутэрыш займаў пасаду Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў. — **Заўв. БелТА**)», — сказаў беларускі дыпламат.

«На заканчэнне сустрэчы генеральны сакратар ААН папрасіў перадаць цёплае прывітанне Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку. Мы дамовіліся аб далейшым падтрыманні кантактаў, — паведаміў беларускі дыпламат. — Мы будзем у поўным аб'ёме аб'ектыўна і непрадузята дакладваць, расказваць генеральнаму сакратару аб тых падзеях, якія будуць адбывацца».

## ПАЦЯРПЕЛЫМІ ПРЫЗНАНЫ 65 ЧАЛАВЕК

Ужо 65 чалавек прызнаны пацярпелымі па крымінальнай справе аб злачынстве супраць бяспекі чалавецтва, адзначыў старшыня Следчага камітэта Дзмітрый Гара, паведаміла БелТА. «Двое грамадзян Рэспублікі Беларусь, адзін грамадзянін Расійскай Федэрацыі — гэта журналісты, астатнія грамадзяне Ірака, сярод якіх 14 непаўналетніх, з іх 6 малалетніх дзяцей, жанчыны, — падкрэсліў старшыня СК. — Мы праводзім допыты, назначаем адразу ж экспертызы для вызначэння ступені цяжкасці нанесеных цялесных пашкоджанняў. Працуем з медыцынскімі ўстановамі для таго, каб вызначыць усё кола асоб, якія звярталіся па медыцынскую дапамогу, усё кола асоб, якія пацярпелі ад проціпраўных дзеянняў».

## СМЕРЦІ І ФЭЙКІ

Група ратавальнікаў з Польскага цэнтра міжнароднай дапамогі паведаміла пра смерць аднагадовага дзіцяці-бежанца ў лесе на тэрыторыі Польшчы, перадала радыё RMF24. Інцыдэнт адбыўся ў польскім прыграніччы. Прыбыўшы на месца падзей, ратавальнікі знайшлі трох бежанцаў, якія мелі патрэбу ў медыцынскай дапамозе. У маладога чалавека ўзніклі моцныя болі ў жываце, ён быў галодны і абязводжаны. Акрамя яго, у дапамозе мела патрэбу сірыйская пара: у мужчыны была рваная рана на руцэ, а ў жанчыны — нажавое раненне галёнкі. Іх дзіця памерла ў лесе. Па словах ратавальнікаў, гэтыя людзі правялі ў лесе 1,5 месяца. Пацярпелыя былі дастаўлены ў бальніцу.

На мінулым тыдні ў Хайнаўскім павеце супрацоўнік лесагаспадарчай службы знайшоў у лесе цела 20-гадовага сірыйца. Выкрыццё паказала, што прычынай смерці мужчыны магло быць пераахаладжэнне. Паводле інфармацыі, раней прадстаўленай польскай паліцыяй, з канца верасня ў Падляскім ваяводстве ў прыгранічнай зоне былі знойдзены целы яшчэ шасці іншаземцаў.

Гета бязлітасная праўда. На жаль, па той бок граніцы не спыняецца фабрыка фэйкаў. У прыватнасці, літоўскі бок не толькі цынічна маніпулюе безабароннымі бежанцамі, але і дэзынфармуе міжнародныя арганізацыі. Аб гэтым паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «Літоўскія сілавікі выкарыстоўваюць непрыкрыты падман і метады, якія зневажаюць чалавечую годнасць. Яны даставілі са сваёй тэрыторыі на лінію граніцы групу бежанцаў для пастановачнай відэаздымкі. Амаль дзве гадзіны прымушалі людзей, якія шукаюць абароны ў краінах, выконваць каманды. Маніпулюючы бездапаможнасцю бежанцаў, сілавікі спецыяльна задавалі ім правакацыйныя пытанні, якія дыскрэдытуюць беларускі бок», — распавялі ў ДПК. Іншаземцам загадалі стаць каля літоўскага пагранічнага знака, на камеру раздалі пакеты з ежай, а затым дэманстратыўна павезлі ўсіх назад. «Відавочна, што літоўскі бок цынічна маніпулюе не толькі безабароннымі бежанцамі, але і дэзынфармуе міжнародныя арганізацыі», — рэзюмавалі ў Дзяржпагранкамітэце.

З'явілася новае пацвярджэнне дзейнасці міжнародных злачынных груповак, якія займаюцца пераправкай бежанцаў. Еўрапейскі саюз плануе налета правесці шэраг аперацый, накіраваных на барацьбу з нелегальнай перавозкай мігрантаў, падчас якіх будзе праведзена больш за 1,4 тысячы арыштаў. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на брусельскае інтэрнэт-выданне EUobserver. Раней нямецкае выданне Die Welt паведаміла, што паліцэйская служба Еўрапейскага саюза расследуе дзейнасць разгалінаванай сеткі кантрабандыстаў, у якой удзельнічаюць жыхары Германіі, Польшчы і Нідэрландаў. Па звестках Еўрапола, кантрабандысты арганізоўваюць перавозку нелегальных мігрантаў з Блізкага Усходу праз Беларусь і Польшчу ў Заходнюю Еўропу.

## СТО АЧКОЎ НАПЕРАД

Варшава выконвае заказ на правакаванні вайны, яна раздзімае для гэтага перадумовы. Пра гэта заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» расійскі палітолаг Уладзімір Кірэеў. «Польскі ўрад, польская дзяржава закла-почаны не гэтымі бежанцамі. Іх невялікая колькасць, і ніякага значэння для польскай бяспекі або польскай самасвядомасці яны не нясуць. Польскае кіраўніцтва выконвае заказ з боку Вашынгтона і Лондана на правакаванні вайны. Яно раздзімае для гэтага перадумовы», — сказаў Уладзімір Кірэеў. Паводле яго слоў, уся гэтая міграцыйная праблема з'яўляецца медыйнай. «Яна з'яўляецца паліттэхналагічнай. Гэта свайго роду піяр, які накіраваны на тое, каб сфарміраваць у еўрапейцаў і амерыканцаў разуменне, чаму палякі пачнуць вайну супраць Беларусі. Ніякай іншай прычыны ў гэтым няма», — адзначыў палітолаг.

Прапанаваны Аляксандрам Лукашэнкам дыялог па праблеме бежанцаў на беларуска-польскай граніцы стаў для Еўропы сываратжай праўды. Такое меркаванне БелТА выказаў загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін. «Адкрытасць і логіка ў выбары варыянтаў развіцця сітуацыі кіраўніком дзяржавы не проста маральна абяззброілі безаблічных еўрачыноўнікаў, але і вызначылі непрыглядны лёс Польшчы. Польскае кіраўніцтва, расстаўляўшы палітычныя пасткі для Беларусі і старой Еўропы, само ў іх і трапіла. Паспрабаваўшы разыграць палітычную гульню адначасова супраць сваіх саюзнікаў і Беларусі, польскае кіраўніцтва для сябе выбрала памылковы метад выжывання і стала палітычным ізгоем, перайграўшы саміх сябе. Спасылаючыся на міфічныя правы людзей і свабоды, а таксама на нейкую сістэму каштоўнасцяў, якая не дае магчымасці весці дыялог або вырашаць прадметна праблемы з мігрантамі, калектыўны Захад прадэманстраваў тупіковасць сваёй палітыкі і смерць аднапалярнага свету. Многія забываюць, што менавіта цяпер дзеючыя Меркель, Макрон, Байдэн, Джонсан і шэраг іншых псеўдалідараў (і тыя, хто ўжо ў адстаўцы) выбудоўвалі дзесяцігоддзямі еўрапейскую карумпіраваную структуру нецярпімасці, прагнасці, двайных стандартаў», — пераканаы аналітык. Нядзіўна, што ў заходніх СМІ пачалася такая істэрыка пасля размоў Аляксандра Лукашэнкі і Ангелы Меркель, якую прынамсі нават абвінавацілі ў тым, што яна зневажае Еўропу.

Паводле меркавання Мікалая Шчокіна, разброд і хістанне ў Старым свеце, мафіёзнасць мыслення чыноўнікаў, злачынныя дзеянні НАТА, адраджэнне расізму і сегрэгацыі, а таксама нацызму сведчаць аб непазбежнай эвалюцыі ў бок выраджэння заходняй цывілізацыі. «З пункту гледжання паліттэхналогіі і геапалітычных інтарэсаў Аляксандр Лукашэнка ў гэтай сітуацыі даў фору на сто ачкоў наперад. Зыходзячы з гуманных прынцыпаў, Прэзідэнт і беларускі народ праявілі найлепшыя чалавечыя якасці, ратуючы ад немінучай гібелі бежанцаў. Адначасова інсінуацый збеглых па дыялогу з імі адказ адназначны: збеглыя — гэта злачынцы, і яны павінны панесці пакаранне і быць у турме. Са злачынцамі і тэрарыстамі Беларусь дыялог не вядзе», — адзначыў Мікалай Шчокін.

На яго думку, пацвярджэнне генеральным сакратаром ААН таго, што Беларусь не з'яўляецца ні крыніцай, ні прычынай патокаў бежанцаў, сведчыць, што праўда на нашым баку. «У сувязі з гэтым усе пагрозы польскага кіраўніцтва аб перакрыцці чыгуначных зносін з Беларуссю — праяўленне комплексу непаўнацэннасці і інтэлектуальнай абмежаванасці нават у падыходах самазахавання. У будучыні польскі народ не дарує сваёму кіраўніцтву прыніжэння сваёй нацыі. Прымерыўшы на сябе маску палітычных ілюмінатаў, польскае кіраўніцтва стала на шлях самаразбурэння і выступіла значным каталізатарам унутрыеўрапейскіх канфліктаў і барацьбы як паміж палітычнымі, так і фінансавымі кланамі», — сказаў эксперт. Ён упэўнены, што цяпер выхад з крызісу з бежанцамі можа заключацца толькі ў кампраміснам знаходжанні ситуацыйных рашэнняў.

**Пётр ДУНЬКО.**

# «ХОЧАЦЦА ВЕРЫЦЬ, ШТО КАМПРАМІС БУДЗЕ ЗНОЙДЗЕНЫ»

**Пасяджэнне кансультатыўнага савета пры Міністэрстве замежных спраў па справах беларусаў замежжа прайшло ў Мінску. Адна з галоўных тэм, якая гэтымі днямі хвалюе прадстаўнікоў беларускіх дыяспар, — няпростая сітуацыя на беларуска-польскай граніцы і ўрэгуляванне крызісу з бежанцамі. Кіраўнікі і прадстаўнікі беларускіх арганізацый у іншых краінах падзяліліся сваімі меркаваннямі з гэтай нагоды.**

**Сяргей КАНДЫБОВІЧ, старшыня федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі»:**

— Мне здаецца, тут занадта шмат штучна створаных перашкод. Так званы калектыўны Захад гатовы любую сітуацыю сказіць і прадставіць у самым нявыгадным святле для Саюзнай дзяржавы, бо беларуска-польская граніца насамрэч — гэта граніца Саюзнай дзяржавы і Еўропы. Таму я мяркую, што кіраўнікі нашых дзяржаў зробяць шмат, каб гэты крызіс вырашыць. Ёсць мноства варыянтаў, якія мы ведаем з інфармацыйных крыніц, таму я мяркую, што ўсё завершыцца добра найперш для людзей, якія трапілі ў такую няпростую сітуацыю. Мы з радасцю назіраем, што кіраўнік беларускай дзяржавы даў усе распараджэнні, каб максімальна дапамагчы: гэта і пункты абагрэву, харчаванне, медыцынскае абслугоўванне, вакцынацыя. Таму мы спадзяёмся, што гэты віток крызісу будзе пераадолены.

**Алена ЛАЗАРАВА, старшыня праўлення Саюза беларусаў Латвіі:**

— Гэтая сітуацыя накладвае вялікую адказнасць на беларускі бок, і нельга не дапамагчы гэтым людзям, сярод якіх шмат жанчын і дзяцей, усе яны знаходзяцца ў дастаткова цяжкіх умовах. Для нас важна, каб сапраўды гэты крызіс быў вырашаны, бо ён складаны і для Беларусі, і для Еўропы. Мы перажываем і вельмі хочам, каб усё было вырашана з мінімальным абвастрэннем адносін і людзі не пацярпелі. Вельмі не хацелася б эскалацыі канфлікту — гэта самае несприяльнае развіццё падзей. Хочацца верыць, што будуць знойдзены кампраміс і дастойнае вырашэнне.

**Людміла АННУС, старшыня праўлення нарвскага беларускага таварыства «Сябры», Эстонія:**

— Мы вельмі перажываем і спачуваем гэтым людзям. Абвінавачваць Прэзідэнта Беларусі, як гэта робіць і эстонская прэса, і еўрапейская, у тым, што ўсё зроблена наўмысна, канешне, грэшна. Гэтыя людзі шукаюць лепшага жыцця і ідуць туды, куды іх клікалі, а іх сапраўды клікалі — хадзілі з плакатамі Welcome. Нагнятанне канфлікту, якое мы назіралі з прымяненнем вадамётаў і святлошумавых гранат, — гэта ў мірны час на мяжы чалавечых адносін. Мы гэта асуджаем і лічым, што палякі ўжо занадта заўзята ўзяліся за тое, каб не пусціць у Германію гэтых людзей, якія нават не збіраюцца жыць у Польшчы.

**Ала САНДЛЕР, прадстаўнік беларускай дыяспары ў Вашынгтоне, ЗША:**

— Мне бясконца шкада людзей, якія апынуліся ў такой сітуацыі. Усе простыя людзі ім спачуваюць. І мы ўсе спадзяёмся на найхутчэйшае аднаўленне дыялогу і станоўчы вынік. У гэтай сітуацыі відавочна непаразуменне, і калі б людзі маглі дамовіцца паміж сабой, гэта адлюстравалася б на тых, хто ў марозе сядзіць на граніцы і чакае вырашэння свайго лёсу.

**Дзмітрый РАМАНОЎСКІ, прадстаўнік беларускай грамадскай арганізацыі «Беларусь-форум», Германія:**

— Канешне, балюча глядзець на сітуацыю, якая склалася на беларуска-польскай граніцы, асабліва на людзей, якія сталі яе заложнікамі. У гэтым пытанні мусіць быць толькі дыялог, які дапаможа як мага хутчэй вырашыць гэту сітуацыю, каб не пакутавалі людзі. Ён павінен быць і з боку Еўрасаюза, і з боку Беларусі. Наколькі я разумею, беларускі бок гатовы весці дыялог і як мага хутчэй вырашыць гэта пытанне. Тое ж самае датычна і Германіі. На сёння вельмі добра, што Ангела Меркель выступае мосцікам у дыялогу паміж Беларуссю і Еўрасаюзам у вырашэнні гэтай праблемы. Я спадзяюся, што ў хуткім часе ўсё вырашыцца.

**Алена КРАВЕЦ**

# «ЧЫСЦІНЯ СЛОВА —

## У Савеце Рэспублікі прайшоў тэматычны круглы стол,

**Што зрабіць, каб дрэнныя словы не гучалі ў грамадскі месцах? Як перабіць гэты «трэнд» у маладзёжным асяродку? Якія крокі неабходна зрабіць, каб чысціня мовы стала звычкай? Адказ на гэтыя пытанні шукалі сенатары, святары, навукоўцы, кіраўнікі міністэрстваў, грамадскіх арганізацый і прадстаўнікі Маладзёжнага парламента.**



### КАБ МІР І ДАБРЫНЯ БЫЛІ З НАМІ

— Я хачу сказаць аб супрацоўніцтве Беларускай праваслаўнай царквы і дзяржаўных органаў, якое выйшла на абсалютна новы ўзровень — калі мы разам вырашаем пытанні, што хвалююць людзей, уплываюць на развіццё грамадства, такія вечныя ісціны, як міласэрнасць, дабрыня, шчырасць у адносінах да адно аднаго, — адзначыла на пачатку круглага стала **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

Яна нагадала, што нядаўна ў Полацку прайшло сумеснае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі з прадстаўнікамі Беларускай праваслаўнай царквы, прысвечанае праблемам п'янства і алкагалізму ў грамадстве.

— Па ініцыятыве мітрапаліта Веніяміна, які звярнуўся да нас з просьбай, мы праводзім мерапрыемства, прысвечанае чысціні слова і таму, як людзі размаўляюць адно з адным, — акцэнтавала ўвагу спікер верхняй палаты парламента.

Яна звяртае ўвагу: на першы погляд можа падацца, быццам праблема не так востра стаіць перад грамадствам, але пры больш шчыльным яе вывучэнні відаць: праблема, сапраўды, ёсць.

— Тое, як людзі размаўляюць паміж сабой і ўмеюць па-добраму ставіцца адзін да аднаго, выказваючы гэта словамі, — важна, — пераканана Наталля Качанава. — Гэта характарызуе культуру паводзін, узровень развіцця нашага грамадства.

Спікер вярнулася да падзей мінулага года, якія паказалі, што ў шэрагу момантаў страчвалася культура паводзін, чалавечыя нормы, нормы зносін.

— Гэта было страшна. Калі людзі перасталі разумець, што і каму яны кажуць, як звяртаюцца. Гэта дало штуршок да таго, каб убачыць праблему, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Яна прапанавала ўдзельнікам абмяняцца меркаваннямі з той мэтай, каб выпрацаваць комплексны падыход да далейшай работы ў гэтым кірунку:

— Мы павінны даваць ацэнку гэтым негатыўным момантам і шчыльна праводзіць работу па чысціні слова і працягваць яе на сістэмнай аснове: з удзелам прадстаўнікоў грамадскасці, БПЦ, членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і ўсіх нераўнадушных, якія перажываюць за развіццё сваёй краіны, свайго народа і за тое, каб мір і дабрыня былі з намі, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Сімвалічна, што мерапрыемства праходзіць у Год народнага адзінства. І ўсе выпрацаваныя меры павінны ўплываць на дабрабыт нашага народа, краіны і грамадства.

### ПРЫШЧЭПКА АД БРЫДКАСЛОЎЯ

— Слова ад Бога стваральнае. Місія слова — благаслаўляць, радаваць, ствараць дабро. Але яго творчая моц можа быць накіравана і на нядобры бок. Брыдкае слова нясе ў свет зло, памнажаючы яго. У ім гучаць гнеў і апаганьванне. Яно разбурае ўнутраны свет, пашкоджваючы розум, псіхічнае здароўе як тых, хто яго агучвае, так і тых, на каго яно накіравана, — лічыць **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ВЕНІЯМІН.**

Ён перакананы, што мова патрабуе да сябе вельмі трапяткога стаўлення, бо менавіта слова з'яўляецца нябачнай сувяззю паміж целам і духам. І датычыцца гэта не толькі асобнага чалавека.

— Мова — душа народа, аснова яго культуры. Выкарыстанне нячыстых слоў разбурае галоўнае багацце — унутраную чысціню, цнатлівасць і маральнасць грамадства, — падкрэслівае святар.

Ён звяртае ўвагу на тое, што гісторыкамі, культуролагамі, філасофамі неаднаразова падкрэслівалася, што станаўленню народа, яго маральнаму і духоўнаму ўзрастанню спадарожнічае развіццё мовы, якая становіцца ўсё больш багатай, выразнай, дасканалай. І, наадварот, дэградацыя, згасанне народа, суправаджаецца збядненнем яго гаворкі, шырокім распаўсюджаннем зніжанай, абсцэннай лексікі.

— На жаль, узровень культуры нашага грамадства пакідае жадаць лепшага. Ненарматыўнай лексікай карыстаюцца многія, але асабліва дзеці і падлеткі, — працягвае думку Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі **намеснік старшыні Сінадальнага інфармацыйнага аддзела БПЦ Андрэй ЛАМАКІН.** — На жаль, у маладзёжнай культуры выкарыстанне брыдкіх слоў нярэдка ўспрымаецца як пазітыўная рыса, прыкмета сучаснасці, знаходжання ў трэндзе. І хоць гэты факт не такі адназначны, існуе і культурная моладзь, накіраваная на высокія, жыццесцвярджальныя ідэалы, якая сочыць за культурай мовы, але праблема не знікае.

Святар расказаў, што ў праваслаўнай традыцыі ненарматыўная лексіка называецца брыдкаслоўем і лічыцца грахом.

— Грэх брыдкаслоўя страшны тым, што мы грашым супраць адной з рыс падабенства Божага ў нас. Адпаведна, дрэннае слова скажае ў чалавеку тое, праз што ён становіцца падобным да Бога, скажае любоў, чысціню, прастату душы, — тлумачыць ён. — Таму выкарыстанне брыдкаслоўя ачарняе ў нас дар слова, які адрознівае нас ад усяго іншага бачнага тварэння. І барацьба супраць брыдкаслоўя — не барацьба супраць шкоднай звычкі, гэта барацьба за тое, каб заставацца чалавекам.

Святар задаецца пытаннем: што ж тады рабіць, каб змяніць сітуацыю да лепшага?

— Якой бы ні здавалася вялікай праблема, існуюць канкрэтныя крокі па яе вырашэнні, — перакананы Андрэй Ламакін. — І ў першую чаргу — добры прыклад.

Ён перакананы, што аўтарытэтныя прыклады заўсёды ўплываюць на чалавека, асабліва падлетка.

— Калі лаяцца матам няправільна, то тады як правільна? — пытае ён і дае адказ. — У гэтым сэнсе СМІ і сродкі інтэрнэт-камунікацыі — ідэальная прастора для ўкаранення добрага прыкладу і высокай культуры мовы.

> **«Тое, як людзі размаўляюць паміж сабой і ўмеюць па-добраму ставіцца адзін да аднаго, выказваючы гэта словамі, — важна. Гэта характарызуе культуру паводзін, узровень развіцця нашага грамадства».**

Святар нагадвае, што сярод сучасных падлеткаў вялікая колькасць разважлівых людзей, і для іх абавязкова важна бачыць альтэрнатыву. Таму, на яго погляд, з гэтай задачай справіцца яркія асобы ў медыйнай прасторы, напрыклад, блогеры, якіх святар лічыць самымі відавочнымі прэтэндэнтамі на папулярызацыю культуры мовы.

Не трэба забывацца і аб уздзеянні сям'і, якая ў норме павінна мець на дзіця больш моцнае ўздзеянне ў адрозненне ад культуры вуліцы.

— Чым жывуць сучасныя сем'і? Ці ёсць у іх месца ўтульным сямейным святам, цікавым падарожжам і любімым традыцыям? Гэта асобная вялікая тэма для размовы, — перакананы Андрэй Ламакін.

### СТАЛІ МЕНШ РАЗМАЎЛЯЦЬ

Чаму ў маладзёжным асяродку такая папулярная ненарматыўная лексіка? Сваім меркаваннем падзяліўся **дэкан філалагічнага факультэта БДПУ імя М. Танка Васіль СТАРЫЧОНАК.** Прафесар лічыць адной з прычын нізкага ўзроўню культуры мовы тое, што студэнты і школьнікі мала размаўляюць. Ён кажа, што зараз рэдка можна пачуць прыгожую, інтанацыйна выверaную, граматычна і лагічна правільную гаворку.

— Студэнты на занятках стараюцца адмоўчвацца, а выкладчыку трэба выцягваць словы, якія дакладна характарызуюць якуюсьці з'яву, выказваюць асабісты пункт гледжання. Такое «маўчанне» студэнтаў не садзейнічае выпрацоўцы неабходных маўленчых навыкаў, — падзяліўся вопытам педагог.

Ён згодны са сцвярджэннем папярэдняга спікера, што асаблівы ўплыў на стан маўленчай культуры аказваюць сродкі масавай інфармацыі, і звяртае ўвагу на тое, што ў многіх перадачах і друкаваных выданнях сустракаюцца нематываваныя запазычанні, жаргонная лексіка. У перадачах для моладзі часта прапагандуюцца кар'ерныя поспехі, культ гвалту і грошай, імкненне да абагачэння без прыкладання намаганняў. І прыгадаў папулярныя сярод моладзі «Comedy club», «Наша Раша», «Забойная ліга», «Бландзінка ў шакаладзе», шоу мадэльера Сяргея Зверава.

— У іх прадстаўлена ўся «разнастайнасць» маладзёжнай лексікі: ад слэнгавых выразаў да нецэнзурных і брыдкіх слоў, — звяртае ўвагу Васіль Старычонак. — Наўрад ці рэдактары задумваліся аб выніках «прышчэплівання» маладым людзям непісьменнасці і маўленчай безгустоўшчыны.

Не выключэннем з'яўляецца і песенны жанр, кажа педагог. У многіх сучасных песнях актыўна выкарыстоўваюцца прастамоўі і жарганізмы, стылістычна зніжаная і абразлівая лексіка.

— Прымітывізм і абсурднасць тэкстаў часта суправаджаецца схаваным падтэкстам, — лічыць Васіль Старычонак і ў якасці прыкладаў прыводзіць гурт «Ленінград» і яго салістa Сяргея Шнурава. — Самае жахлівае, што такія праграмы і песні карыстаюцца папулярнасцю ў студэнтаў і школьнікаў, якія часта капіруюць выразы зорак і ўключаюць у свой маўленчы запас жаргонныя словы, ненарматыўную і абсцэнную лексіку. Усё гэта пужае філолагаў і прымушае ўзнімаць праблему экалогіі мовы і культуры, забруджвання маўленчага асяродку.

Акрамя таго, брыдкаслоўе негатыўна ўплывае на чалавека, кажа прафесар: зніжае ўзровень інтэлекту; праціздзейнічае эфектыўным зносінам; збядняе мовы і мысленне; негатыўна ўплывае на навакольных; разбурае біяполе чалавека; разбурае свядомасць, светаадчуванне; апаганьвае чалавека, забівае яго душу; павышае агрэсію і гэтак далей.

Педагог задаецца пытаннем, вядомым з класічнай літаратуры: што рабіць? І прапануе арганізаваць выкладанне курса «Культура мовы і маўленчы этыкет» («Лінгвістычная экалогія») ва ўсіх установах адукацыі. З яго пункту гледжання, установы педагагічнай адукацыі павінны стаць «прасторай чыстага маўлення».

### ВУЧАЦЬ У ШКОЛЕ...

З актуальнасцю ўзнятай на круглым стале тэмай згодны і **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.** Ён падкрэсліў, што ў прафілактыцы брыдкаслоўя і выкарыстання непрыстойнай лексікі асаблівае значэнне мае вучэбны працэс і звярнуў увагу ўдзельнікаў, што адной з задач навучання рускай, беларускай, замежнай мовам з'яўляецца фарміраванне маўленчай культуры і камунікатыўных уменняў навучэнцаў. Менавіта на ўроках мовы і літаратуры абагачаецца іх слоўнікавы запас, адбываецца развіццё дыялагічнага і маналагічнага маўленчага навыку.

Намеснік міністра расказаў удзельнікам круглага стала, што вялікую дапамогу ў пераадольванні брыдкаслоўя аказваюць урокі літаратуры.

# ЧЫСЦІНЯ ДУШЫ»

## на ім абмеркавалі праблему маўленчай культуры

— Мастацкія творы класікаў літаратуры з'яўляюцца эталонам правільнай, багатай і выразнай мовы. Аналіз тэксту, гаворкі герояў дазваляюць убачыць, асэнсаваць і «прысвоіць» узоры ветлівага, культурнага выяўлення думак і пачуццяў, — перакананы Аляксандр Кадлубай.

У прафілактыцы брыдкаслоўя задзейнічаны і ўрокі грамадазнаўства, дзе навучэнцы даведваюцца аб адміністрацыйнай адказнасці за нецэнзурныя выразы ў грамадскіх месцах:

— У вучэбным дапаможніку прапаноўваюцца практычныя сітуацыі, у якіх неабходна ацаніць, якое спагнанне будзе накладзена на непаўналетняга, які здзейсніў дробнае хуліганства ў выглядзе нецэнзурнай лаянкі ў публічным месцы, — прыводзіць прыклад намеснік міністра.

**«Слова ад Бога стваральнае. Місія слова — благаслаўляць, радаваць, ствараць дабро. Але яго творчая моц можа быць накіравана і на нядобры бок. Брыдкае слова нясе ў свет зло, памнажаючы яго. У ім гучаць гнеў і апаганьванне. Яно разбурае ўнутраны свет, пашкоджваючы розум, псіхічнае здароўе як тых, хто яго агучвае, так і тых, на каго яно накіравана.**
**Мова патрабуе да сябе вельмі трапяткога стаўлення, бо менавіта слова з'яўляецца нябачнай сувяззю паміж целам і духам. І датычыцца гэта не толькі асобнага чалавека. Мова — душа народа, аснова яго культуры. Выкарыстанне нячыстых слоў разбурае галоўнае багацце — унутраную чысціню, цнатлівасць і маральнасць грамадства».**



Паводле яго слоў, культура стасункаў фарміруецца ў навучэнцаў і ў межах пазаўрочнай дзейнасці, на факультатыўных занятках. Напрыклад, на факультатыве «Правілы ў маім жыцці», разлічаным на школьнікаў 2—4-х класаў, яны атрымліваюць элементарныя правілы паводзін у грамадскіх месцах і дома, факультатывы «Вучымся жыць у міры і згодзе» (5—8-е класы) скіраваны на фарміраванне ўмення будаваць адносіны з іншымі людзьмі, паважлівае стаўленне да закона і адказнасці за свае дзеянні. Вучэбная праграма «Асновы сучаснага этыкету» (8—11-е класы) накіравана на фарміраванне ўяўленняў аб нормах і правілах этыкету, уменняў і навыкаў сацыяльна прымальных паводзін. У праграме «Духоўна-маральнае выхаванне і патрыятызм» разглядаецца ўплыў слова на духоўны свет чалавека.

— У распрацаваных дапаможніках гэтых факультатыўных заняткаў адпрацоўваюцца формулы ветлівасці, звароту, ацэнкі пачуццяў, — тлумачыць Аляксандр Кадлубай.

Акрамя таго, ён звяртае ўвагу, што работа па пераадольванні брыдкаслоўя з'яўляецца актуальнай пры правядзенні павышэння кваліфікацыі педагогаў.

— Выхаванне навучэнцаў, стварэнне аптымальных умоў для гарманічнага развіцця асобы падрастаючага пакалення, у тым ліку работа па пераадольванні брыдкаслоўя, уваходзіць у лік асноўных задач дзейнасці ўстаноў адукацыі, — падкрэсліў намеснік міністра адукацыі. — І гэты аспект нашай сумеснай дзейнасці патрабуе пастаяннай увагі і сістэмнага падыходу, высокага ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці яе арганізатараў.

## А ШТО КАЖА ЗАКОН?

— Узаемадзеянне паміж людзьмі адрозніваецца сваёй шматграннасцю і, на жаль, не заўсёды бывае гладкім, часцяком пераходзячы на асобы, — кажа **першы намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Юрый НАЗАРАНКА.** — Часам канфлікты прымаюць выгляд татальнага тролінгу, могуць выяўляцца і ў іншых формах хамскіх паводзін.

Лагічнымі ў гэтай сувязі выглядаюць пытанні з пункту гледжання закона: а якія меры можна выкарыстаць і як прадухіліць узнікненне канфліктаў і іх наступстваў?

Першы намеснік міністра патлумачыў, што абраза ўяўляе сабой наўмыснае прыніжэнне гонару і годнасці асобы, якая выяўляецца ў непрыстойнай форме. Адказнасць за яе вызначаецца часткай 1 артыкула 10.2 КаАП і прадугледжвае штраф да 30 базавых велічынь. Трэба сказаць, што на практыцы штогод да адказнасці за такія правапарушэнні прыцягваецца звыш пяці тысяч чалавек.

— Што датычыцца брыдкаслоўя, — кажа прадстаўнік профільнага міністэрства, — яно, на жаль, стала свайго роду бытавой з'явай.

Ён патлумачыў, што раней нецэнзурная лаянка ў грамадскім месцы лічылася адміністрацыйным правапарушэннем — дробным хуліганствам. З лібералізацыяй заканадаўства ў 2018-м гэтая з'ява як самастойная разнавіднасць дробнага хуліганства з Адміністрацыйнага кодэкса выключана.

— На сёння непасрэднае выкарыстанне ненарматыўнай лексікі ў грамадскім месцы не можа выступаць у якасці канчатковага складу дробнага хуліганства, — кажа Юрый Назаранка. — У той жа час нецэнзурная лаянка застаецца прыкметай, якая кваліфікуе іншую супрацьпраўную дзею, напрыклад абразлівае чаплянне да грамадзян.

У гэтым выпадку, кажа ён, парушальнік можа трапіць на штраф ад 2 да 30 базавых і грамадскіх работ да адміністрацыйнага арышту.

Трэба сказаць, што некаторыя брыдкія словы могуць несці ў сабе пагрозу, аднак намераў увасабляць іх у жыццё, як правіла, няма. У той жа час пры пэўных умовах агучаныя пагрозы могуць разглядацца як злачынствы. Калі?

Напрыклад, у адпаведнасці з арт. 186 Крымінальнага кодэкса злачынствам з'яўляецца пагроза забойствам, прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў ці знішчэннем маёмасці агульна небяспечным спосабам, калі былі падставы яе ажыццявіць. За гэта прадугледжаны розныя віды пакарання, ажно да пазбаўлення волі да трох гадоў.

## АБРАЗА ВІРТУАЛЬНАЯ — АДКАЗНАСЦЬ РЭАЛЬНАЯ

Расказаў намеснік міністра і аб павелічэнні зарэгістраваных фактаў абраз і пагроз у сецiве.

— Лічачы, што інтэрнэт забяспечвае абсалютную ананімнасць, такія асобы зневажаюць не толькі маральна-этычныя нормы, але і парушаюць закон, — нагадвае Юрый Назаранка і звяртае ўвагу, што нацыянальнае заканадаўства аператыўна адрэагавала на гэтую сітуацыю.

У прыватнасці, падчас падрыхтоўкі новага Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях вылучаны асобныя саставы, якія прадугледжваюць павышаную (у параўнанні са звычайнай абразай) адказнасць за такія дзеянні з выкарыстаннем інфармацыйных і іншых медыярэсурсаў. Цяпер правапарушальнік можа нарвацца на штраф да 200 базавых велічынь альбо на адміністрацыйны арышт.

Як патлумачыў выступоўца, з моманту дзеяння новага кодэкса да адміністрацыйнай адказнасці за такія правапарушэнні прыцягнута больш за 160 чалавек.

— Пры гэтым праблемнай тэндэнцыяй застаецца выказванне пагроз як у адрас прадстаўнікоў улады, так і іх блізкіх. Выразна гэта праявілася ў постэлектаральны перыяд, — кажа першы намеснік міністра ўнутраных спраў.

Таму ў бягучым годзе крымінальная адказнасць стала больш жорсткай за такія злачынствы. Сёння за абразу прадстаўніка ўлады ў якасці максімальнага пакарання прадугледжана пазбаўленне волі да трох гадоў і штраф (раней было два), за пагрозы — да сямі гадоў замест папярэдніх пяці.

Як адзначыў Юрый Назаранка, у структуры пратэснага толку больш чым траціна дзеянняў крымінальнага характару так ці інакш звязана з пагрозамі і абразамі. Большасць з іх (амаль 75 %) здзейснена ў адносінах да супрацоўнікаў міліцыі. Больш за 90 % такіх злачынстваў зафіксавана ў сецiве.

— На сёння падазраваныя выяўлены практычна ў кожным другім выпадку, — паведаміў прадстаўнік профільнага міністэрства. — Па крымінальных справах, што былі заведзены па фактах замахаў у адносінах супрацоўнікаў міліцыі, асуджана больш за 300 асоб.

Напрыканцы Юрый Назаранка нагадаў, што заўсёды неабходна ўзважліва і абдуманна падыходзіць да рэалізацыі права на вольнае выказванне меркавання, не дапускаць дзеянняў, якія парушаюць правы іншых, незалежна ад перакананняў, сацыяльнай і прафесійнай прыналежнасці. Міліцыянеры ў рабоце з насельніцтвам заклікаюць людзей да гэтага. Таму, лічыць выступоўца, такога ж падыходу павінны прытрымлівацца іншыя суб'екты прафілактыкі і дзяржаўныя органы.

**«Гісторыкамі, культуролагамі, філосафамі неаднаразова падкрэслівалася, што станаўленню народа, яго маральнаму і духоўнаму ўзрастанню спадарожнічае развіццё мовы, якая становіцца ўсё больш багатай, выразнай, дасканалай. І, наадварот, дэградацыя, згасанне народа, суправаджаецца збядненнем яго гаворкі, шырокім распаўсюджаннем зніжанай, абсцэннай лексікі».**

## РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

Падсумоўваючы вынікі работы круглага стала, Наталля Качанава адзначыла:

— Для грамадскасці тут вялікае поле дзейнасці. Не пачнём займацца праблемай брыдкаслоўя комплексна, нічога не атрымаецца. А гэта напрамую датычыцца развіцця грамадства, нашай культуры, паводзін, у цэлым пытання сапраўднага патрыятызму, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента.

Таму па выніках работы круглага стала эксперты выпрацавалі некаторыя рэкамендацыі.

У прыватнасці, **Міністэрству адукацыі** — падумаць над стварэннем курса «Культура мовы і маўленчы этыкет» і ўкараніць яго ва ўсе ўстановы адукацыі. Акрамя таго, увесці тэмы па прафілактыцы ненарматыўнай лексікі ў праграму факультатыву «Асновы духоўна-маральнага выхавання і патрыятызму». Уключыць у мерапрыемствы ў рамках праекта «ШАГ» (Школа актыўнага грамадзяніна) тэмы па эстэтыцы стасункаў у маладзёжным асяродку. Правесці рэспубліканскі круглы стол «Экалогія слова ў электронным маўленчым асяродку» і міжнародны кангрэс «Маўленчая культура і міжмаўленчыя камунікацыі». А таксама вызначыць установы педагагічнай адукацыі «прасторай чыстага маўлення».

**Міністэрству інфармацыі** — падрыхтаваць відэаролікі, накіраваныя на прафілактыку і выкараненне брыдкаслоўя і сацыяльную рэкламу для размяшчэння ў СМІ, сацсетках, на банерах.

**Нацыянальнай акадэміі навук** — уключыць у тэматыку навукова-даследчых работ у сацыяльна-гуманітарнай галіне вывучэнне праблемы абсцэннай лексікі і вербальнай агрэсіі як сацыяльнай з'явы.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**фота БелТА.**

# СТАРЫ СВЕТ У «ЧЫРВОНАЙ ЗОНЕ»

## Чаму Еўропу накрыла маштабная ковідная хваля?



**Еўропа зноў апынулася ў сусветным эпіцэнтры каранавіруснай пандэміі. За мінулы тыдзень — новы антырэкорд: зафіксавана больш чым 2,1 мільёна новых хвароб. Ахвярамі COVID-19 сталі больш за 28 тысяч чалавек. Пра гэта паведаміла Сусветная арганізацыя аховы здароўя. Паводле даных СААЗ, колькасць новых выпадкаў інфіцыравання ў Старым свеце павялічылася на восем працэнтаў, а смяротных зыходаў — на пяць працэнтаў, паведаміла ТАСС. На гэты рэгіён прыпадае па выніках сямі дзён 64 працэнты тых, хто заразіўся на планеце, і 57 працэнтаў сусветнага паказчыка смяротных зыходаў. Пры гэтым у Еўропе, па меркаванні спецыялістаў, сітуацыя пагаршаецца з кожным днём. Чаму Стары свет накрыла маштабная ковідная хваля, чаго чакаць надалей?**

### Дзясятка «вельмі трывожных»

Дзесяць краін ЕС былі ўнесены ў «вельмі трывожны» спіс інфіцыравання COVID-19, аб якім на мінулым тыдні абвясцілі прадстаўнікі Еўрапейскага цэнтра па кантролі за захворваннямі (ECDC), паведаміла Associated Press. У сваёй апошняй ацэнцы ступені рызыкі заражэння каранавірусам чыноўнікі адзначылі, што эпідэміялагічная сітуацыя ў краінах — членах Еўрапейскага саюза, асабліва ў Заходняй Еўропе, зараз характарызуецца хуткім і значным пашырэннем распаўсюджвання захворвання і павелічэннем смяротнасці. Чакаецца, што ў найбліжэйшай перспектыве колькасць выпадкаў захворвання, шпіталізацыі, а таксама смяротных зыходаў павялічыцца, паведаміла еўрапейскае агенцтва, якое базіруецца ў Стакгольме.

10 з 27 дзяржаў супольнасці — Бельгія, Польшча, Нідэрланды, Балгарыя, Харватыя, Чэхія, Эстонія, Грэцыя, Венгрыя і Славенія — адносяцца да катэгорыі найбольш высокай рызыкі заражэння, удакладніла Associated Press. У катэгорыю так званых трывожных краін унесены Германія, Аўстрыя, Данія, Фінляндыя, Ірландыя, Латвія, Літва, Люксембург, Румынія і Славакія. Тры краіны адносяцца да катэгорыі «ўмеранай заклапочанасці» (Францыя, Партугалія, Кіпр), а чатыры — «слабай рызыкі заражэння» (Італія, Іспанія, Швецыя і Мальта).

Метад, які выкарыстоўваецца ECDC для катэгорый, што выклікаюць заклапочанасць, спалучае ў сабе так званыя абсалютныя значэнні (колькасць выпадкаў заражэння, шпіталізацыі і смяротных зыходаў), а таксама ўзровень росту паказчыкаў заражэння за пэўны перыяд. Згодна з прагнозамі экспертаў арганізацыі, колькасць выпадкаў захворвання і смерцяў у Заходняй Еўропе можа вырасці прыкладна на 50 працэнтаў на працягу наступных двух тыдняў, дасягнуўшы штотыднёвага паказчыка 300 новых выпадкаў заражэння і 2,7 смяротнага зыходу на 100 тысяч жыхароў.

Сярод дзяржаў Еўропы найбольшая колькасць тых, хто заразіўся, выяўляецца цяпер у Вялікабрытаніі і Германіі. Паводле даных Our World In Data, за тыдзень у кожнай з гэтых краін зафіксавана больш чым чвэрць мільёна захварэлых. Рэзкі рост колькасці заражаных з улікам колькасці насельніцтва назіраецца ў Аўстрыі, а таксама ў краінах Усходняй Еўропы.

Як паведаміла агенцтва Associated Press, у моргу галоўнага шпіталя Бухарэста, сталіцы Румыніі, у апошнія дні не хапала месцаў. «Наша краіна перажывае сапраўдную катастрофу — сотні і сотні ахвяр штодня», — прызнаў яшчэ ў мінулым месяцы прэзідэнт Румыніі Клаус Ёханіс. У гэтай краіне зараз поўнасцю прышчэплена толькі трэць грамадзян.

Румынія займае трэцяе месца ў Еўропе па колькасці зафіксаваных за тыдзень выпадкаў смерцяў ад COVID-19 у пераліку на колькасць насельніцтва. Яе апераджаюць Балгарыя і Латвія. У сувязі з ускладненнем сітуацыі балгарскае Міністэрства аховы здароўя з 4 лістапада прыпыніла планавы прыём і правядзенне планавых аперацый у бальніцах, паведаміў kommersant.ru.

У цэлым у Еўропе сітуацыя надзвычай трывожная. «Мы зноў у эпіцэнтры», — канстатаваў у пачатку лістапада дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Ханс Клюге. Паводле яго слоў, усе 53 краіны ў рэгіёне сутыкнуліся з «рэальнай пагрозай адраджэння COVID-19 або ўжо змагаюцца з ёй». «Згодна з адным дакладным прагнозам, калі тэндэнцыя працягнецца, то да 1 лютага наступнага года ў Еўропе і Цэнтральнай Азіі мы можам убачыць яшчэ паўмільёна смерцяў ад COVID-19», — папярэдзіў ён, папрасіўшы ўлады еўрапейскіх краін не паслабляць каранцінныя меры.

### Складаныя тыдні

Заклік быў пачуты. У Аўстрыі ад панядзелка пачалі дзейнічаць жорсткія абмежаванні для ўсіх невакцынаваных грамадзян, старэйшых за 12 гадоў. Жылыя памяшканні ім можна пакідаць толькі ў выключных выпадках, каб схадзіць у аптэку, бальніцу, прадуктовую краму ці заняцца спортам. «Нас нагнала па поўную моц чацвёртая хваля», — прызнаў напрыканцы мінулага тыдня канцлер Аўстрыі Аляксандр Шаленберг. Паводле яго слоў, вакцынацыя знаходзіцца на «ганебна нізкім узроўні». У Аўстрыі цалкам прышчэплены 63 працэнты насельніцтва — адзін з самых нізкіх паказчыкаў у Заходняй Еўропе. У апошнія тыдні ў краіне рэгіструецца амаль 12 тысяч новых выпадкаў заражэння. Улады не выключаюць і агульнанацыянальны каранцін для ўсіх без выключэння.

У сваю чаргу, кіраўніцтва ФРГ, дзе таксама кажуць аб чацвёртай хвалі пандэміі, вырашыла вярнуць бясплатнае тэсціраванне на каранавірус для грамадзян. Пры гэтым выконваючы абавязкі кіраўніка нямецкага Міністэрства аховы здароўя Енс Шпан прапанаваў абавязаць перахварэлых і прышчэпленых ад COVID-19 здаваць дадатковыя тэсты для наведвання мерапрыемстваў. Хоць у Германіі цалкам вакцынавана звыш 65 працэнтаў дарослага насельніцтва, аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі, піша газета Suddeutsche Zeitung, перагружаны нават «больш, чым год таму, калі не было вакцын».

Пра тое, што сітуацыя крытычная, сведчыць і паведамленне выдання Spiegel аб планах нямецкіх улад мабілізаваць у дапамогу медыкам да 12 тысяч вайскоўцаў. «Наперадзе складаныя тыдні, і я вельмі ўстрывожана», — заявіла ў мінулую суботу канцлер ФРГ Ангела Меркель і заклікала прышчапіцца ўсіх, хто гэта яшчэ не зрабіў.

### Абмежаванні і пратэсты

Да патрабавання насіць медыцынскія маскі ў грамадскіх месцах і частковага лакдаўну, які будзе дзейнічаць да 4 снежня і закране нават вакцынаваных грамадзян, вярнуліся Нідэрланды. Тым часам улады Бельгіі вырашылі, што ўсе жыхары краіны павінны атрымаць бустэрную дозу вакцыны. А прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон анансаваў, што з 15 снежня перастануць дзейнічаць COVID-пашпарты асоб, старэйшых за 65 гадоў, якія не зрабілі рэвакцынацыю. Сітуацыя з распаўсюджваннем віруса ў краіне менш крытычная, чым, напрыклад, у суседняй Германіі. Зрэшты, кіраўнік французскага Міністэрства аховы здароўя Аліўе Веран у эфіры канала TF1 ужо папярэдзіў аб пагрозе новай хвалі.

Акрамя таго, улады працягнулі да 31 ліпеня 2022-га пераходны перыяд пасля рэжыму надзвычайнай санітарнай сітуацыі, які дзейнічаў з канца мая. Ён мяркуе, у прыватнасці, што прэм'ер-міністр без узгаднення з парламентам можа выдаваць дэкрэты аб абмежаванні перамяшчэння грамадзян па тэрыторыі краіны і работы грамадскіх месцаў. Аднак урад ясна даў зразумець, што не жадае паўторнага лакдаўну, заявіў iz.ru французскі палітолаг Жан-Лў Камю. Паводле яго слоў, новая ўспышка пандэміі выклікана ў тым ліку тым, што такія элементарныя правілы, як нашэнне маскі, адмова ад поціскаў рукі, мыццё рук з дэзсродкам, больш не ўспрымаюцца насельніцтвам дастаткова сур'ёзна, асабліва маладымі людзьмі.

Узмацняюць меры і ўлады Вялікабрытаніі: з красавіка для ўсіх медыкаў будзе дзейнічаць абавязковае патрабаванне наяўнасці прышчэпкі. Працягвае павялічвацца колькасць выпадкаў захворвання і шпіталізацыі ў Партугаліі. Каб спыніць распаўсюджванне каранавіруса напярэдадні зімы і сезона водпускаў, эксперты настойваюць на скарачэнні інтэрвалу паміж другім і трэцім уколам. Гэта, у прыватнасці, дасць магчымасць паскорыць вакцынацыю пажылых. «Набліжаюцца Каляды, у нас мільёны грамадзян, якія жывуць за мяжой, многія з іх прыедуць наведаць свае сем'і, і многія прыязджаюць з краін, дзе ўзровень вакцынацыі нашмат ніжэйшы, чым у нас. Гэта азначае, што мы павінны дзейнічаць свядома, каб правесці Каляды без страху», — заявіў прэм'ер-міністр Партугаліі Антоніу Кошта.

З абмежаваннямі пагадзіліся далёка не ўсе еўрапейцы. Сотні пратэстоўцаў выйшлі на вуліцы галандскіх гарадоў пасля таго, як у пятніцу ўрад Нідэрландаў аб'явіў аб увядзенні частковага лакдаўну.

### Не да свят

Новую хвалю ўлады большасці еўрапейскіх краін звязваюць найперш з недастатковым тэмпамі вакцынацыі. Па долі поўнасцю вакцынаваных у пераліку на колькасць насельніцтва ў Еўропе лідзіруюць Партугалія (87,5 %), Мальта (83,2 %) і Іспанія (80 %), сведчаць даныя Our World In Data. І гэта тыя нямногія дзяржавы ў рэгіёне, якім удаецца трымаць распаўсюджванне COVID-19 пад кантролем. Праўда, як заявілі апытаныя iz.ru еўрапейскія спецыялісты, новая ўспышка каранавіруса пацвярджае той факт, што вакцынацыя яшчэ не азначае поўнага вызвалення ад мер засцярогі.

«Нават пры высокім ахопе вакцынацыі ў Еўропе мільёны людзей усё роўна яшчэ не прышчэпленыя. Важна разумець, што эфектыўнасць вакцын у зніжэнні рызыкі заражэння не складае 100 %, а імунітэт слабее праз 4—6 месяцаў. У некаторых краінах былі адменены меры па зніжэнні рызыкі заражэння (маскі, сацыяльная дыстанцыя), так што цыркуляцыя віруса і, як вынік, колькасць новых выпадкаў павялічваюцца, — заявіў эпідэміёлаг Інстытута фармакалагічных даследаванняў імя Марыё Негры (Італія) Антоніа Клавена. Улады Італіі, якія перажылі хвалю пратэстаў пасля ўвядзення пашпартоў вакцынацыі для наведвання працоўных месцаў, зараз разглядаюць магчымасць увядзення абавязковай рэвакцынацыі супрацоўнікаў сістэмы аховы здароўя. У апошнія дні ў краіне назіраецца рост колькасці заражэнняў, які набліжаецца да паказчыкаў летніх месяцаў.

Сярод іншых фактараў — распаўсюджванне варыянта «дэльта» і іншых мутацый каранавіруса. Паводле звестак Цэнтраў па кантролі і прафілактыцы захворванняў ЗША, дэльта-штам у два разы больш заразны, чым усе папярэднія варыянты віруса. Апроч гэтага, навукоўцы з Барселонскага інстытута глабальнай аховы здароўя (ISGlobal) Іспаніі выявілі ў COVID-19 прыкметы сезоннасці, пра што раней пісаў часопіс Nature Computational Science.

Усё гэта можа зноў прывесці да абмежаванняў на зімовых святах. У шэрагу гарадоў Нідэрландаў, як перадае The Guardian, ужо адмянілі калядныя парады. Пад пагрозай могуць аказацца і знакамітыя нямецкія калядныя кірмашы. «Нельга ўявіць, як ты стаіш на калядным кірмашы, п'еш глінтвейн, пакуль бальніцы перапоўнены, а ўрачы змагаюцца з апошніх сіл», — абурыўся ў эфіры канала NTV прэм'ер-міністр нямецкай Саксоніі Міхаэль Крэчмер. А старшыня парламента ФРГ Бербель Бас напярэдадні заклікала суграмадзян «устрымацца ад буйных урачыстасцяў» на Каляды і Новы год. Пакуль Еўропе дакладна не да свят.

**Захар БУРАК.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Столтэнберг прыгразіў размяшчэннем ядзернай зброі ЗША ва Усходняй Еўропе



**Амерыканскія ракеты могуць з'явіцца ва Усходняй Еўропе, калі Германія адмовіцца размясціць іх на сваёй тэрыторыі. Пераносам ядзерных узбраенняў НАТА на ўсход прыгразіў генеральны сакратар альянсу Енс Столтэнберг у Берліне, перадае ТАСС.**

«Германія можа вырашаць, ці павінна быць узбраенне на яе тэрыторыі, але альтэрнатыва гэтаму — ядзерная зброя ў іншых еўрапейскіх краінах, у тым ліку на ўсход ад Германіі», — заявіў Столтэнберг.

### Житомірскі суд выклікаў Цукерберга з-за справы аб адной грыўні

**Карасцянскі суд Житомірскай вобласці пастанавіў прыцягнуць заснавальніка і ўладальніка Facebook Марка Цукерберга да разгляду справы аб пакрыцці маральнай шкоды. Аб гэтым піша «Житомір.info».**

Гаворка ідзе аб грамадзянскім іску, пададзеным кіраўніком Житоміра Іванам Карудам на мясцовага палітыка Аляксея Краўчука. Ён патрабуе прызнаць выказванні свайго апанента ў сацсетцы, якія ганьбяць гонар, годнасць і дзелавую рэпутацыю, і спагнаць з адказчыка адну грыўню (прыкладна 8 рублёў).

Каруда хадайнічаў аб прыцягненні да ўдзелу як суадказніка ў разглядзе справы ўладальніка сайта Facebook, рэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі, які пражывае па адрасе: Willow Rd, Menlo Park, CA, 94025. У выпадку прызнання асноўнага адказчыка вінаватым суд абавяжа Цукерберга выдаліць усе выказванні.

### У Маскве перад аўкцыёнам паказалі ліст Кацярыны ІІ аб неабходнасці вакцынацыі

**Перад продажам на аўкцыёне MacDougall's быў паказаны ліст Кацярыны ІІ аб неабходнасці вакцынацыі ад воспы. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны».**

Па даных інфармагенцтва, унікальнасць ліста Кацярыны ІІ заключаецца ў тым, што гэта першы вядомы гістарычны дакумент аб прышчэпачнай кампаніі ў Расіі. «Паміж іншымі прадметамі пасады... адным з найгалоўнейшых шанавацца павінна прышчэпліванне», — піша Кацярына падчас свайго вандравання ў Крым генералу-фельдмаршалу графу Пятру Румянцаву і падрабязна тлумачыць, як вакцынацыю ажыццявіць на дзяржаўным узроўні.

Доктар мастацтвазнаўства Алег Хромаў растлумачыў, што Кацярыне ІІ прышчапілі воспу ад хлопчыка. Вакцынацыі тады не існавала: у руцэ рабіўся надрэз, куды змяшчаўся біяматэрыял, узяты ад хворага чалавека. З найбліжэйшага акружэння прыклад імператрыцы паўтарылі амаль 150 чалавек. Царыца праводзіла актыўную агітацыю, каб пераканаць людзей зрабіць прышчэпку.

# Лідары па малаку і не толькі

## З якімі фінансавымі і вытворчымі паказчыкамі сустракаюць прафесійнае свята брэсцкія аграрыі

**Напярэдадні свята карэспандэнт «Звязды» пагутарыла са старшынёй камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама Анатолем ШЧУПЛЯНКОВЫМ пра асаблівасці аграпрамысловага комплексу Брэстчыны, кірункі развіцця галіны, прамежкавыя вынікі сельскагаспадарчага года.**



— Асновай аграпрамысловага комплексу рэгіёна з'яўляецца жывёлагадоўля, якая дае звыш 80 працэнтаў выручкі. Выраз «малочныя рэкі» — гэта пра нас, бо 60 працэнтаў эканомікі жывёлагадоўчай галіны складае рэалізацыя малака, — пачынае размову Анатоль Леанідавіч. — Як і раней, Брэсцкая вобласць з'яўляецца лідарам у краіне па малочнай жывёлагадоўлі. Пры гэтым вытворчасць малака ў нас паступова расце. За студзень — кастрычнік яна ўзрасла да ўзроўню мінулага года крыху больш як на два працэнты, а, скажам, у Іванаўскім і Пінскім раёнах — на шэсць, у Драгічынскім і Бярозаўскім — больш чым на пяць. Па выніках года чакаем атрымаць каля 1,9 мільёна тон малака, удой на карову — не менш за 6550 кілаграмаў.

Разам з тым ідзе паступовае нарошчванне прадукцыі мясной жывёлагадоўлі. Сёлета плануем атрымаць 148,3 тысячы тоны ялавічыны, што складае 101,3 працэнта да ўзроўню мінулага года. Выхад прадукцыі свінаводства не паменшыцца.

***— Большую частку аб'ёмаў прадукцыі жывёлагадоўлі даюць па-ранейшаму буйныя комплексы. Якія перспектывы ў гэтым кірунку?***

— На дзеючых комплексах увесь час вядзецца мадэрнізацыя. Пераведзены на сучасныя рэйкі ўсе свінакомплексы. Уведзены ў строй новыя: ААТ «Брэсцкага мясакамбіната» ў Жабінкаўскім раёне, ААТ «Пінскага камбіната хлебапрадуктаў» магутнасцю 24 тысячы галоў. На ўказаных прадпрыемствах атрыманы прыросты 911 і 960 грамаў адпаведна. Гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у краіне.

Нашы знакамітыя комплексы — Белавежскі, Заходні — маюць высокую ступень зношанасці, таму разглядаецца магчымасць будаўніцтва новых аб'ектаў. У планах зараз — рэалізацыя інвестыцыйнага праекта па будаўніцтве свінагадоўчага комплексу на 24 тысячы галоў каля вёскі Вялікія Дзікавічы Пінскага раёна. Рэалізацыя праекта дазволіць стварыць больш за паўсотні новых рабочых месцаў і атрымліваць штогод да чатырох тысяч тон мяса.

***— Як вядома, вытворчыя паказчыкі нараўне са штодзённай карпатлівай работай людзей забяспечваюцца таксама мадэрнізацыяй вытворчасці, укараненнем новых тэхналогій, пастаянным тэхнічным пераўзбраеннем. Прапаную пагаварыць пра новую тэхніку і абсталяванне, пра новыя вытворчыя аб'екты.***

— Варта сказаць, што за дзевяць месяцаў гэтага года ў сельскую гаспадарку вобласці накіравана 650 мільёнаў рублёў інвестыцый, у тым ліку на тэхніку і абсталяванне — 267 мільёнаў рублёў, на будаўніцтва аб'ектаў — 152 мільёны. Сельгаспрадпрыемствы набылі ў лізінг 683 адзінкі тэхнікі і абсталявання, у тым ліку 54 збожжаўборачныя камбайны, 34 кормаўборачныя машыны, 145 трактароў.

Сёлета ўведзена ў эксплуатацыю сем малочнатаварных ферм, будаўніцтва і рэканструкцыя працягваюцца яшчэ на 26 фермах. Куплена два дзясяткі дайльных залаў на суму 17 мільёнаў рублёў.

Работы па мадэрнізацыі жывёлагадоўчых аб'ектаў вядуцца за кошт уласных сродкаў арганізацый, дырэктыўнага крэдытавання, а таксама за кошт сродкаў Банка развіцця. Летась чатыры гаспадаркі выйгралі конкурс Банка развіцця на фінансаванне будаўніцтва малочнатаварных ферм, сёлета — дзве гаспадаркі.

***— Што можна сказаць пра эканамічную эфектыўнасць прадпрыемстваў, іх фінансавы стан?***

— Фінансавыя вынікі ў сельскай гаспадарцы трэба ацэньваць у самым канцы года ці нават на пачатку новага, калі ўсе палявыя работы поўнасцю завяршыліся, падлічаны і прааналізаваны выдаткі і прыбытак. Але па выніках дзевяці месяцаў відаць, што ад рэалізацыі прадукцыі атрымана выручкі амаль на 15 працэнтаў больш, чым летась. Прыбытак ад рэалізацыі вырас на 18,7 працэнта, чысты прыбытак — на 29 працэнтаў. Страты па канчатковым фінансавым выніку атрымалі толькі шэсць арганізацый, што складае 2,8 працэнта ад іх агульнай колькасці. Фінансавыя паказчыкі паспрыялі таму, што заработная плата ў сельскай гаспадарцы вырасла на 13 працэнтаў, за дзевяць месяцаў яна склала 1057 рублёў.

***— Прафесійнае свята аграрыі адзначаюць разам з працаўнікамі перапрацоўчай галіны. Што можна сказаць пра ўклад апошніх у агульную справу забеспячэння якаснымі прадуктамі айчыннага спажыўца і тых, хто купляе нашу прадукцыю за мяжой?***

— Сёння асабліва перспектыўным выглядае развіццё сыравінных зон. Гэтым займаюцца сумесна гаспадаркі і перапрацоўшчыкі малака і мяса. Сельгасарганізацыі атрымліваюць фінансавую дапамогу не толькі ў выглядзе авансаў у залік будучых паставак сыравіны, але таксама ў выглядзе займаў і аказання спонсарскай дапамогі. Сродкі накіроўваюцца на фарміраванне стабільнай і якаснай кармавой базы, закупку ветэрынарных прэпаратаў, лабараторнага абсталявання, а таксама на будаўніцтва і рэканструкцыю ферм, іх тэхнічнае абслугоўванне. Такая сумесная работа дазваляе нарошчваць аб'ёмы і перапрацоўчым прадпрыемствам.

Толькі ўявіце сабе: са студзеня да кастрычніка нашы прадпрыемствы перапрацавалі 1,6 мільёна тон малака і 110 тысяч тон мяса! Гэта, дарэчы, адчувальна больш, чым летась. Выпушчана звыш 80 тысяч тон сыроў, 23,6 тысячы тон масла сметанковага, каля сотні тон каўбас і мясных паўфабрыкатаў. Пры гэтым значна пашыраны і пастаянна абнаўляецца асартымент прадукцыі. Цалкам забяспечаны патрэбы ўнутранага рынку, каля 70 працэнтаў малочнай прадукцыі і каля 40 працэнтаў мясной ідзе на экспарт. Геаграфія экспартных паставак налічвае 42 краіны свету. Сёлета з'явіліся новыя адрасы экспарту: Ірак, ПАР, Кот-Д'Івуар, Сьера-Леонэ, Лівія, Егіпет, Бангладэш.

Брэндавыя брэсцкія перапрацоўшчыкі здабываюць прыхільнасць спажыўца найперш выдатнай якасцю сваіх тавараў. Але ж з адной сыравіны высакаякасны прадукт харчавання не зробіш, апошняе проста немагчыма. Таму працаўнікам вёскі ёсць чым ганарыцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


МК
СТОЛБЦОВСКИЙ МЯСОКОНСЕРВНЫЙ КОМБИНАТ

# ААТ «СТАЎБЦОЎСКІ МЯСАКАНСЕРВАВЫ КАМБІНАТ»

**з 1929 года паспяхова працуе на рынку мясной прадукцыі. Асартымент прадукцыі, якая выпускаецца, настолькі шырокі, што нават самы вытанчаны пакупнік можа абраць прадукт у адпаведнасці з яго смакавымі перавагамі і дастаткам. Традыцыйныя тэхналогіі і рэцэптуры ў спалучэнні з прагрэсіўнымі і сучаснымі дазваляюць вырабляць прадукцыю высокага ўзроўню і асвойваць прынцыпова новыя віды вырабаў.**




Асартымент прадукцыі пастаянна абнаўляецца. Для гурманаў прадпрыемства ўвяло ў вытворчасць паўфабрыкат мясны натуральны астуджаны з ялавічыны **«Стэйк Рыбай»**. Для яго вырабу выкарыстоўваецца спінная частка ялавічыны вільготнага паспявання мяса.

Асвоілі вытворчасць прадукту сыравэнджанага мяснога **«Каўбаса Феліна»** з хуткім тэрмінам паспявання, што дазваляе павялічыць вытворчасць сыравэнджаных прадуктаў. Смакавай асаблівасцю дадзенага прадукту з'яўляецца выкарыстанне букета спецый, якія надаюць непаўторны смак і водар іспанскага хамону.

Распрацавалі рэцэптуру і ўкаранілі ў вытворчасць каўбаскі паўвэнджаныя **«Торуньскія»** вышэйшага сорту. Перавагай каўбасак з'яўляецца вяндлінны смак і універсальнасць ужывання ў ежу: традыцыйна ў астуджаным выглядзе, можна прыгатаваць на грылі, разагрэць у мікрахвалевай печы, запекчы ў духавой шафе.

Дзякуючы ўстаноўцы новых камер для тэрмічнай апрацоўкі прадуктаў, у прадпрыемства з'явілася магчымасць выпускаць запечаныя прадукты. Адным з такіх з'яўляецца каўбаса паўвэнджаная вышэйшага сорту **«Дамашка свіная»**. Адмысловы, насычаны мясны смак і водар дасягаецца даданнем характэрных для нашага краю вострых прыправаў: часнаку, каляндры, сумесі чорнага, белага і духмянага перцаў. Працэс запякання надае прадукту непаўторны карычнева-вішнёвы колер.

Запяканне выкарыстоўваецца таксама пры вытворчасці каўбасы крывяной **«Кашанка дамашняя»**, якая асабліва спадабалася аматарам традыцыйных вясковых прадуктаў. У рэцэптуры кашанкі прымяняюцца толькі натуральныя спецыі і рэзкія травы без дадання штучных кампанентаў.

Прадпрыемства вырабляе на працягу васьмі гадоў кансервы сечаныя — мясныя флякі — па тэхналогіі польскіх майстроў. На сёння лінейка складаецца з чатырох відаў: **«Флякі па-стаўбцоўску»**, **«Флякі па-стаўбцоўску ў таматным соусе»**, **«Флякі па-стаўбцоўску з фасолькай»**, разнастайнасць густаў дазваляе задаволіць патрэбы розных катэгорый кліентаў. Традыцыі і рэцэптура польскага прадукту «Флякі» з беларускімі асаблівасцямі спадабалася жыхарам нашай краіны.




Цікавым вонкавым выглядам пакупнікоў прыцягваюць каўбаскі варана-вэнджаныя **«МІХ для грылю»** вышэйшага сорту. У адной упакоўцы размяшчаюцца каўбаскі трох колераў з характэрнымі смакамі: каўбаскі чорнага колеру маюць рэзкі смак часнаку і чорнага перцу, чырвона-карычневы колер у каўбасак з яркім смакам вяленых таматаў і базіліка, ноткі цытрыну і імбіру можна адзначыць у каўбасках белага колеру. Такія каўбаскі, несумненна, здзівяць і стануць любімым ласункам для ўсёй сям'і.

Для хуткага перакусу тэхнолагамі распрацаваны сыравэнджаныя каўбаскі **«Снэкі Хабуга»** вышэйшага сорту. Тоненькія каўбаскі з лёгкім смакам грэцкага арэху ацэняць і госці на святочным стале.

Прадукцыя, якую выпускае ААТ «Стаўбцоўскі мясакансервавы камбінат», шырока вядома не толькі жыхарам Беларусі, але і далёка за яе межамі.

УНН 691098545

ААТ «Птушкафабрыка
«Рассвет»




Паважаныя калегі і партнёры, работнікі і ветэраны

СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ГАЛІНЫ!

*Прыміце шчырыя віншаванні з прафесійным святам — Днём работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці! Праца на зямлі ва ўсе часы карыстаецца асаблівай пашанай і павагай. Менавіта вы, працаўнікі палёў і ферм, абслуговых вытворчасцяў, перапрацоўчых прадпрыемстваў, з'яўляецеся надзейным гарантам харчовай бяспекі нашага рэгіёна і краіны ў цэлым. Работнікі сельскай гаспадаркі застаюцца прыкладам працавітасці і стойкасці, вернасці і адданасці сваёй справе. У прафесійнае свята прыміце пажаданні моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту, новых працоўных поспехаў, плённай работы ў вырашэнні задач па развіцці і працвітанні галіны.*

**Калектыў ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет».**











УНП 400047993


# І восеньскі дзень год корміць

**У апошнія гады капрызы надвор'я значна ўплываюць на сельскую гаспадарку Гомельшчыны. Каб мінімізаваць негатыўныя фактары прыроды, аграрыі рэгіёна імкнуцца шукаць свае падыходы да сістэмы земляробства. Падбор культур, карэкціроўка тэрмінаў сяўбы, павышэнне якасці насеннага матэрыялу і іншыя меры дазваляюць на належным узроўні забяспечваць сыравінай перапрацоўчую галіну, задавальняць патрэбы насельніцтва ў асноўных прадуктах харчавання. Акрамя таго, сёння амаль палова выра бленага на Гомельшчыне харчавання экспартуецца ў шэраг краін свету.**



## КАРАВАЙ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Па выніках сёлетняга аграрнага сезона ў Гомельскай вобласці намалочана ў цэлым звыш дзевяцісот сямідзесяці трох тысяч тон збожжа (з улікам кукурузы). Намалочана амаль 182 тысячы тон кукурузнага збожжа.

— У гэтым сезоне з-за анамальнай спякоты і працяглай засухі не выдужала нават царыца палёў — ураджай ніжэйшы за леташні. Хоць вясной былі даволі добрыя прагнозы па гэтай культуры. Тым не менш, думаю, у кожнай гаспадарцы зроблена ўсё для таго, каб выйсці на добрыя паказчыкі, — адзначыла **начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі раслінаводства Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Алена ФІЛІПОВІЧ.** — На тэрыторыі Гомельскай вобласці знаходзіцца кукуруза-калібровачны завод у ДП «Крынічнае» Мазырскага раёна па вытворчасці гібрыднага насення кукурузы, і ў сямі раёнах вырошчваюцца насенныя пасевы. З агульнага ўраджаю кукурузнага збожжа звыш 15 з паловай тысячы тон зерня будзе выкарыстана як насенны матэрыял. Збожжа ачысцяць, дапрацоўць, і ў наступным годзе гібрыды першага пакалення будуць засяваць на палях рэгіёна і іншых абласцей. Дзяржзаказ па пачатках кукурузы выканалі ўсе гаспадаркі.

## ЦАРЫЦА ПАЛЁЎ І ГАЛОЎНАЯ КАРМАВАЯ КУЛЬТУРА

Для аграрыяў Гомельшчыны адна з самых важных задач — забяспечыць пагалоўе буйной рагатай жывёлы якаснымі кармамі на зіму.

— У гэтым годзе недаатрымалі збожжавых, але змаглі павялічыць запас 234,9 тоны — плюс 118 % да мінулагодняга паказчыка, сенажу — 1243 тысяч тон — плюс 130 % да ўзроўню мінулага года. Для патрэб грамадскага пагалоўя нарыхтавалі 266 тысяч тон канцэнтратаў (91,3 працэнта да мінулага года). План уборкі кукурузы на сілас і зялёны корм у рэгіёне выкананы на 100 %, — падкрэслівае начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі раслінаводства.

Сіласу нарыхтавана 3 мільёны 261 тысяча тон, на адну ўмоўную галаву — 28,77 цэнтнера кармавых адзінак травяных кармоў. Сёлета таксама 121 тысяча тон сенажу нарыхтавана ў палімернай упакоўцы.

## ДРУГІ ХЛЕБ

На Гомельшчыне складаным гэты аграрны сезон выдаўся і для бульбы. Другі хлеб быў пасаджаны на 3,2 тысячы гектара, атрымана 52,2 тысячы тон караняплодаў. Лепш за астатнія раёны вобласці ўрадзіла бульба ў Буда-Кашалёўскім і Калінкавіцкім раёнах. Сёлета больш за 7,7 тысячы тон гэтай культуры закладзена ў стабілізацыйны фонд плодаагароднінай прадукцыі рэгіёна.

## УСТОЙЛІВЫ РЫНАК І САЦЫЯЛЬНЫ АСПЕКТ

Прынамсі, Гомельшчына — адна з абласцей, якая не знізіла аб'ёмы закладкі стратэгічнага харчовага запасу з прадукцыі айчыннай вытворчасці. Цяпер у рэгіёне працягваецца рэалізацыя сельгаспрацукцыі, у тым ліку ў папулярным фармаце выязнога гандлю. У адпаведнасці з рашэннем аблвыканкама сёлета ў стабфонды акрамя бульбы закладваецца звыш 10 тысяч тон агародніны, больш як паўтары тысячы тон яблык.

— Кіраўніцтва рэгіёна паставіла задачу сфарміраваць плодаагародніннны запас у вобласці пад поўную патрэбнасць. Менавіта стабфонды гарантавана забяспечаць агароднінай і садавінай айчыннай вытворчасці ўсе сацыяльныя ўстановы — бальніцы, школы, дзіцячыя садкі, дамы састарэлых, — звярнула ўвагу начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі раслінаводства Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама.

## ТЭХНАЛАГІЧНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

Між тым сёння перад усімі сельгаспрадпрыемствамі рэгіёна стаіць задача завяршыць восеньскія палявыя работы ў аптымальныя тэрміны і са строгім выкананнем тэхналагічных патрабаванняў.

— Для гомельскіх аграрыяў цяпер задача нумар адзін — унесці арганічныя ўгнаенні і якасна ўзняць зябліва, што неабходна зрабіць на плошчы 241 тысячы гектараў, — удакладніла Алена Філіповіч. — Восеньскае ўзворванне зямлі — важнае звяно тэхналагічнага працэсу. Гэта дазваляе вырашыць адразу некалькі задач — захаваць вільгаць у глебе, пазбавіцца пустазелля. Уздым зябліва таксама дае вялікую арганізацыйна-эканамічную перавагу: значна памяншае напружанасць веснавых палявых работ, забяспечвае больш якасную перадпасяўную апрацоўку глебы, пасеў сельгаскультур у найлепшыя агратэхнічныя тэрміны.

## НА КАГО РАЎНЯЦЦА

У Камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама ўпэўнены: усе раёны і сельгасвытворцы Гомельшчыны імкнуцца адказна выконваць пастаўленыя перад імі задачы. Асабліва вызначаецца работа працаўнікоў вёскі Мазыршчыны. Гэты раён — адзін з найбуйнейшых вытворцаў сельгаспрадукцыі, на працягу доўгіх гадоў паказвае вынікі, якія перавышаюць сярэднеабласныя. Хочацца адзначыць саўгас-камбінат «Зара» на Мазыршчыне, «Знамя Радзімы» ў Гомельскім раёне, «Калінінскі» на Добрушчыне, «Палессе-Аграінвест» на Петрыкаўшчыне, рэчыцкага лідара «50 гадоў Кастрычніка», «Ціхінічы» на Рагачоўшчыне і многія іншыя. Выклікаюць гонар гаспадаркі, у якіх паспяхова кіруюць жанчыны: «Отар» і «Звязда» — у Чачэрскім раёне, «Завідаўскае» — у Добрушскім.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# Чвэрць стагоддзя ў ліку першых: сакрэты поспеху «Саўгаса-камбіната «Зара»

**Штогод «Зара» пацвярджае сваё лідарства не толькі на раённым, але і на абласным, а таксама рэспубліканскім узроўнях. Фірменны стыль гэтага сельгаслідара Гомельшчыны — высокая культура жывёлагадоўлі, развіццё сучасных тэхналогій і стаўка на якасць.**

Сёння прадпрыемства вылучаецца добрымі паказчыкамі ў вытворчасці малака, ялавічыны, свініны, мяса птушкі, яек. Тут штогод вырабляюць звыш 14 тысяч тон мяса, атрымліваюць больш за 17 тысяч тон малака і амаль 70 мільёнаў яек. «Зара» як прызнаны ўніверсальны сельгасвытворца не саступае лідарскіх пазіцый у рэгіёне і па вырошчванні збожжавых і зернебабовых, кармавых і тэхнічных культур.

## Вядучы кірунак — свінагадоўля

У гаспадарцы свінагадоўля развіваецца на трох вытворчых пляцоўках. За мінулы год было рэалізавана 10,2 тысячы тон мяса свініны. На сёння налічваецца каля 55 тысяч галоў свіней. Рэалізацыя свініны да канца года складзе 10 тысяч тон. Значных вынікаў удаецца дасягнуць перш за ўсё за кошт павелічэння якасных паказчыкаў і сярэднясутачных прыбаўленняў, упэўнены ў гаспадарцы.

## Добрыя пазіцыі па вырошчванні буйной рагатай жывёлы

Гэты кірунак развіваецца на шасці фермах. Зараз колькасць буйной рагатай жывёлы ў «Зары» набліжаецца да васьмі тысяч галоў. Гэта на 100 галоў больш, чым летась. У пагалоўі буйной рагатай жывёлы 2121 дойная карова. Для таго каб з году ў год плюсаваць па малаку, на працягу доўгіх гадоў на сельгаспрадпрыемстве паляпшаюць генетычны патэнцыял статка, належна кампануюць кармавую базу. Адпрацавана ўсё да дробязяў.



Дырэктар КСУП «Саўгас-камбінат «Зара», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Алег СЛІНЬКО.

## Новае слова ў птушкагадоўлі Гомельскай вобласці

У мінулым годзе ў вёсцы Забалацце была ўрачыста адкрыта новая птушкаферма «Саўгаса-камбіната «Зара» па гадаванні бацькоўскага статка птушкі-бройлера. Важнасць гэтага аб'екта цяжка пераацаніць, таму што новая птушкаферма дае магчымасць эканамічна эфектыўна выкарыстоўваць фінансавы і рэсурсны патэнцыялы рэгіёна, для рэалізацыі якога на тэрыторыі Мазырскага раёна створаны ўсе ўмовы. Варта адзначыць, што ферма ў Забалацці ўзведзена на месцы малочнатаварнай фермы. Будаўнічыя работы вяліся за кошт уласных сродкаў гаспадарчым спосабам два гады. Для вытворчасці закуплена адно з найлепшых сучасных еўрапейскіх абсталяванняў, усе працэсы якога поўнасцю аўтаматызаваны. Увогуле, на найбліжэйшыя гады птушкагадоўля — гэта адзін з напрамкаў, які ў гаспадарцы плануюць актыўна развіваць, прадугледжана будаўніцтва дадатковых памяшканняў.

## Свой каравай і корманарыхтоўка

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я ў сёлетнім аграрным сезоне, калектыў «Зары» спрацаваў дакладна і зладжана. Як вынік — валавы збор збожжавых каласавых аказаўся роўным узроўню мінулага года. Што ж датычыцца кукурузнага сіласу, то яго якасць па парадак вышэйшая за мінулагоднюю, а гэта дапаможа гаспадарцы дабіцца яшчэ лепшых вынікаў у галіне жывёлагадоўлі.

Агульны вал збожжа каласавых сельгаспрадпрыемства сёлета склаў 10 794 тоны: з кожнага гектара атрымалі па 38,7 цэнтнера. Акрамя таго, намалацілі 1760 тон насення рапсу пры ўраджайнасці 40,9 цэнтнера з гектара. У гаспадарцы нарыхтавалі 9,4 тысячы тон сенажу, у тым ліку і ў поліэтыленавую плёнку — 1,8 тысячы тон.

## Эканоміка па-мазырскі

Варта адзначыць, што ўся прадукцыя прадпрыемства перапрацоўваецца ва ўласных цэхах. Для яе рэалізацыі працуюць 24 крамы фірменнай сеткі, якія ахопліваюць большасць раёнаў Гомельскай вобласці. Выручка ад рэалізацыі прадукцыі ў месяц складае каля 11 мільёнаў, за бягучы год яе мяркуюць атрымаць не менш, чым летась, а гэта каля 130 мільёнаў рублёў. Чысты прыбытак у месяц — ад 800 тысяч рублёў да мільёна. Самая высокая ў рэгіёне і выручка на аднаго работніка — каля 80 тысяч рублёў.

## Так трымаць!

**Дырэктар КСУП «Саўгас-камбінат «Зара», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Алег СЛІНЬКО:**

— Калектыў «Саўгаса-камбіната «Зара» не стаіць на месцы, не баіцца спрабаваць і эксперыментаваць, укараняць сучасныя тэхналогіі, развіваць новыя напрамкі. Вялікае значэнне ў рабоце прадпрыемства надаецца дабрабыту нашых супрацоўнікаў: належныя ўмовы працы і адна з самых высокіх сярод прадпрыемстваў сельгасгаліны рэгіёна заработная плата — 1700 рублёў. І для нас падтрымліваць калектыў вельмі важна, бо менавіта ён трымае марку і высокі ўзровень прадпрыемства. Дзякуючы зладжанай рабоце каманды, добрасумленнаму, адказнаму падыходу да выканання сваіх абавязкаў, разуменню калектывам важнасці гэтай працы і складаецца той вынік, які саўгас-камбінат мае на дадзены момант. Кожны, хто працуе сёння ў саўгасе-камбінаце «Зара», усё роўна дзе — на ферме або ў полі, у механічнай майстэрні або за штурвалам камбайна, — ведае, што ўсе даброты ствараюцца карпатлівай працай, якая мае належнае ўзнагароджанне. Хочацца спадзявацца, што дасягненні «Зары» могуць паслужыць добрым прыкладам і для іншых сельгаспрадпрыемстваў нашай краіны.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

УНП 400408726

**• ДУП «Саўгас-камбінат «Зара» — пераможца рэспубліканскага спаборніцтва па дасягненні найлепшых вынікаў у сацыяльна-эканамічным развіцці сельскагаспадарчай галіны сярод гаспадарак Беларусі.**






УНП 300061219




# ЖЫЦЬ У АДНЫМ РЫТМЕ З «ЗАРОЙ»

**Гэтымі днямі віншаванні прымае і вядомая гаспадарка Магілёўскага раёна ЗАТ «Агракамбінат «Зара».**

Учора падчас урачыстасцяў з нагоды Дня работніка сельскай гаспадаркі ў Палацы культуры вобласці прадстаўнікі гэтага вялікага калектыву неаднаразова падымаліся на святочную сцэну па ўзнагароды. **Генеральны дырэктар таварыства Кацярына ЗАРОЎСКАЯ** ўшанаваная Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта адзнака за высокі прафесіяналізм і годныя вынікі ў рабоце. Гаспадарка прызнаная найлепшай сярод іншых сельгаспрадпрыемстваў вобласці. Першымі ў сваіх намінацыях сталі **намеснік генеральнага дырэктара па раслінаводстве *(галоўны аграном)* Яўген СЯЛЮГІН, намеснік генеральнага дырэктара па механізацыі *(галоўны інжынер)* Ягор ОСІНЦАЎ, звяно аператараў зернесушыльных установак у складзе Валерыя ЖАРЫНА, Эдуарда МУСУРЫЎСКАГА, Эдуарда КУХАРЭНКІ і Станіслава ВАЛАДЗЬКОВА.** Другое месца сярод камбайнераў вобласці заняў **Аляксей МАКОСАЎ,** які намалаціў амаль 4,5 тысячы тон збожжавых, зернебабовых і рапсу. Тое, што ў маштабах адной гаспадаркі столькі перадавікоў, сведчыць толькі аб адным: тут кожны разумее сваю адказнасць за даверany ўчастак работы і працуе на вынік.

А яшчэ «Зара» цалкам абвяргае меркаванне, што моладзі не цікавая сельская гаспадарка. Сярэдні ўзрост спецыялістаў, якія тут працуюць, — 35 гадоў! Галоўнаму інжынеру Ягору Осінцаву наогул усяго 26! У 2017 годзе ён скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках, адслужыў у арміі і з 2018-га працуе ў агракамбінаце. Стаж яго работы ўсяго тры гады, а ён ужо атрымаў званне найлепшага галоўнага інжынера вобласці!

Абавязкаў у яго шмат. Адказвае за ўсю тэхніку (а гэта каля сотні адзінак) і яе эксплуатацыю (увесь транспарт павінен быць на ходу), пад яго непасрэдным кіраўніцтвам знаходзіцца каля ста чалавек, некаторыя з якіх па ўзросце ў бацькі яму падыходзяць. Але Ягор з усімі знаходзіць агульную мову.

— Усякія бывалі сітуацыі, але я не прыхільнік жорсткіх мер, мне важна прыйсці да агульнага меркавання, — прызнаецца ён. — У калектыве працуе шмат прафесіяналаў, я да іх прыслухоўваюся і вучуся. Гэты вопыт бясцэнны, бо ён напрацаваны.

Работу на зямлі Ягор выбраў свядома. Тут, у агракамбінаце, працуюць і яго бацькі. Школьнае дзяцінства будучага маладога спецыяліста праходзіла на мехдвары. Яго бацька таксама працаваў інжынерам. Калі прыйшоў час вызначацца з прафесіяй, нават не задумваўся, куды ісці. Лічыць, што з работай яму пашчасціла. І зарплата па сённяшніх мерках добрая. Але прэстыж работніка сельскай гаспадаркі трэба падымаць, лічыць ён. У той жа «Зары» дыпламаваных маладых спецыялістаў хапае, а вось рабочых — пакуль недахоп. Тых жа механізатараў, напрыклад.



— Распаўсюджаны стэрэатып, што калі калгас, дык там усё адсталае і прымітыўнае, — разважае Ягор. — Але гэта не так. Сёння камбайны зусім не такія, што былі раней. Унутры кабіны цалкам сучасная рабочая прастора: зручнае сядзенне, кандыцыянер, навігатар. Сёлета ў нас упершыню прымянялася сістэма «аўтапілот». На сёння гэта самы перадавы метад, які патрэбна ўкараняць у сельскай гаспадарцы. Для работы на такой тэхніцы патрэбны сучасныя веды. Можна лічыць за гонар магчымасць на ёй працаваць.

Вядома, работа ў сельскай гаспадарцы няпростая, патрабуе вялікай аддачы. Летам, калі гарачая пара, асабістае жыццё наогул адыходзіць на другі план. Ягор успамінае, наколькі складаной і няпростай была яго першая ўборачная кампанія. Зямлі шмат, трэба было паспяваць паўсюды, кантраляваць, каб усё кругілася. Але з вопытам прыходзіць уменне. І гэта самы каштоўны капітал. Сельская гаспадарка аб'ядноўвае. У адзіночку тут нічога не зробіш. Трэба адчуваць адзін аднаго, умець працаваць у камандзе. Падчас той жа ўборачнай усе зацікаўлены, каб тэхніка ў полі не ламалася, каб запчасткі своечасова мяняліся, каб працэс не перарываўся.

— Гэта своеасаблівы рытм. Калі ты ў яго ўліўся, лічы, усё ў парадку, — усміхаецца Ягор. — Калі я сюды прыйшоў, часу на раскачку не было. Спачатку мяне прынялі на пасаду механіка, але вельмі хутка дарос да галоўнага інжынера, затым намесніка генеральнага дырэктара па механізацыі. Гаспадарка шматпрофільная, даводзілася хутка ва ўсё ўнікаць, запамінаць, хто дзе працуе, якія абавязкі выконвае. Павысілася і адказнасць, бо прыйшло разуменне, што за табой людзі, дарагая маёмасць. Было вельмі цяжка, але ўцягнуўся. Зараз адчуваю ўпэўненасць і разуменне таго, што ніколі нельга сябе абмяжоўваць, усё прыходзіць з вопытам. Трэба проста шчыра рабіць сваю справу.

Работа ў задавальненне, калі адчуваеш аддачу, разумееш, што цябе цэняць і давяраюць. Для маладога чалавека вельмі важна, калі вынікі яго работы атрымалі такую высокую адзнаку. Прызнаецца, што момант ушанавання быў для яго асабліва хвалюючым і важным. Гэта першая буйная перамога і стымул для таго, каб не зніжаць тэмпы, трымаць планку і добра працаваць на карысць сваёй гаспадаркі і краіны ў цэлым.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Ягора ОСІНЦАВА.**

УНП 700124410

### • Толькі факты

**Агульны намалот збожжа ў агракамбінаце «Зара» склаў сёлета 28,5 тоны.** Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых — 59,8 ц/г, рапсу — 58,5 ц/га. Вынік, кажуць тут, ніжэйшы, чым планаваўся, але гэты аб'ём цалкам забяспечыць кармамі патрэбы гаспадаркі.

**Плошча сельгасугоддзяў агракамбіната «Зара» складае** 12 000 гектараў, з іх 9100 — ралля.

**Агракамбінат рэалізоўвае перадавы праект рэканструкцыі** малочнатаварнага комплексу ў Салтанаўцы на 450 галоў.

### • Візітоўка

ЗАТ «Агракамбінат «Зара» — шматпрофільная гаспадарка з замкнутым цыклам вытворчасці, асноўнымі відамі дзейнасці якой з'яўляюцца вытворчасць і перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі, мяса птушкі, вытворчасць кармоў, вырошчванне і перапрацоўка свіней і буйной рагатай жывёлы, аптовы і рознічны гандаль.

**Больш інфармацыі — на сайце zarya-agro.by**

Святочнае

# Будзем з хлебам і малаком!

## У Магілёве падводзяць вынікі ўборкі сёлетняга ўраджаю

**Сёння, напярэдадні прафесіянальнага свята работнікаў сельскай гаспадаркі, Магілёўшчына ўрачыста праводзіць двухдзённы абласны фестываль-кірмаш «Дажынкі-2021». З учарашняга дня Палац культуры вобласці і ўся пляцоўка вакол яго пераўтварыліся ў адну вялікую выстаўку дасягненняў сельскагаспадарчай галіны. Спакусліва лунаюць пахі прыгатаванай на свежым паветры ежы, ногі прытупваюць у такт песень, якія спяваюць артысты мастацкай самадзейнасці на сцэне пад адкрытым небам, а рука сама цягнецца ў кішэню па грошы, каб купіць тое-сёе па прывабнай цане. На кірмашы ўсяго багата, дзякуй працаўнікам сяла, — пастараліся.**



— Год быў складаны, але нашы аграрыі зрабілі ўсё для таго, каб уборачная кампанія прайшла ў адпаведнасці з патрабаваннямі Прэзідэнта краіны — якасна і ў сціслыя тэрміны, — адзначае **першы намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама Вольга ПРЫСТРОМСКАЯ.** — Сёлета ў лідарах Магілёўскі, Шклоўскі і Бялыніцкі раёны. Магілёўскі раён першым у вобласці пераадолеў 100-тысячную мяжу па намалоце збожжа, крыху не дацягнулі да гэтага ўзроўню Шклоўскі і Горацкі раёны. Учора ў Палацы культуры вобласці былі адзначаны пераможцы абласных спаборніцтваў па дасягненні лепшых паказчыкаў па ўборцы ўраджаю зерневых і зернебабовых. Найлепшыя атрымалі ўзнагароды і падзякі, у гонар працаўнікоў сяла адбыўся канцэрт. Сярод тых, каму мы кажам вялікі дзякуй за працу, — адкрытае акцыянернае таварыства «Александрыйскае» і сельгаспрадпрыемства «Газавік Сіпакова» Шклоўскага раёна, «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна і агракамбінат «Зара» Магілёўскага, сельскагаспадарчае прадпрыемства «Аўсянка імя І. Мельніка» і таварыства «Копцеўская Ніва» з Горацкага раёна. Шмат асабістых залікаў. Ну хто сёння ў вобласці не ведае імёны нашых герояў ад сельскагаспадарчай ніві — механізатара Мікалая Дарэчкіна з калгаса «Радзіма», камбайнераў Аляксея Макосава ад агракамбіната «Зара» і Віктара Мільто ад таварыства «Александрыйскае». Удзельнікаў жніва на працягу ўсёй уборачнай кампаніі актыўна падтрымлівала ўся вобласць. Перадавікоў ушаноўвалі проста ў полі, уручылі каштоўныя падарункі і падзякі ад Магілёўскага аблвыканкама, абкама прафсаюза працаўнікоў АПК, грамадскіх арганізацый. Слоў падзякі заслугоўваюць і ўсе тыя, хто працаваў на зернесушыльных установках, іншых не менш адказных месцах.

***— Сёлета падчас уборачнай вельмі добра праявіла сябе моладзь. У хлебаробаў расце годная змена!***

— Так. Асабліва добра спрацавалі маладзёжныя экіпажы таварыства «Світанак» імя К. Арлоўскага» Кіраўскага раёна, яны ўзялі ўсе тры прызавыя месцы. На першым — стрыечныя браты, камбайнеры Андрэй і Сяргей Дразды. Яны прадстаўнікі дынастыі, агульны стаж якой у сельскай гаспадарцы налічвае аж 168 гадоў! Знамянальна, што Андрэй і Сяргей Дразды сталі найлепшым маладзёжным экіпажам не толькі ў вобласці, але і ўвайшлі ў тройку лідараў па краіне.

Прызавое месца ў рэспубліканскім заліку заняў яшчэ адзін прадстаўнік Магілёўскай вобласці, малады кіроўца вучэбнай гаспадаркі «БДСГА» Горацкага раёна Арцемій Касцюкоў. Па рэкордах мінулых гадоў нам таксама знаёма імя маладога кіроўца з сельскагаспадарчага прадпрыемства «Жылічы» Кіраўскага раёна Рамана Шарамета, які і сёлета на абласным узроўні дасягнуў высокіх вынікаў у рабоце. Вельмі радуе, што ў нас расце такая годная змена. Дарэчы, на Магілёўшчыне ёсць прыгожая традыцыя па перадачы працоўнай эстафеты ад старэйшага пакалення малодшаму. І ў святочнай праграме вельмі кранальна прагучаў наказ вопытных працаўнікоў сяла сваім пачынаючым калегам расціць хлеб, берагчы яго і шанаваць як найважнейшы дар на зямлі. Бо спрадвеку лічылася, што, калі на стале ёсць духмяны каравай, значыць, жыццё працягваецца.

***— Вядома, вынікі ўраджаю залежаць не толькі ад працавітых рук, але і ад забяспечанасці гаспадарак тэхнікай.***

— Для абнаўлення машынна-трактарнага парка сельскагаспадарчых арганізацый сёлета ў рамках прынятых кіраўніком дзяржавы рашэнняў былі набыты 267 адзінак сельгастэхнікі і абсталявання. Гэта вялікая дапамога для нашых гаспадарак. Стаўка робіцца таксама на прымяненне найноўшых тэхналогій. Тыя кіраўнікі, якія зацікаўлены ў атрыманні высокага ўраджаю, прытрымліваюцца планамернай мадэрнізацыі сваёй вытворчасці.

***— Адна з цікавых фішак фестывалю-кірмашу «Дажынкі» — яго конкурсы на найлепшы каравай і падворак. Ёсць магчымасць паглядзець у разрэзе, які ўнёсак зрабіў канкрэтны раён у агульную скарбонку.***

— Так, гэта традыцыйныя конкурсы, удзел у якіх бяруць усе раёны Магілёўшчыны. Падчас знаёмства кіраўніцтва вобласці з падворкамі старшыні райвыканкамаў даюць невялічкую справаздачу, чым канкрэтны раён вызначыўся і якіх поспехаў сёлета дасягнуў. Своеасаблівае падвядзенне вынікаў сваёй дзейнасці.

Ну а конкурс караваяў — вельмі прыгожая і відовішчная традыцыя. У свае творы мастацтва з мукі першага ўраджаю пекары ўкладваюць усю фантазію і натхненне.

***— Ад працавітых рук селяніна цалкам залежыць наша харчовая бяспека. Наколькі яна надзейная?***

— На гэты і наступны гады створана трывалая кармавая база для жывёлы, што дазволіць дасягнуць максімальнай яе прадукцыйнасці. Трэба толькі захоўваць высокую тэхналагічную, выканаўчую і працоўную дысцыпліну. Для забеспячэння ўраджаю 2022 года праведзена работа па сяўбе азімых культур з захаваннем тэхналогіі іх апрацоўкі. Павялічаны плошчы пасеву азімага ячменю як найбольш ураджайнай культуры ранняга тэрміну паспявання.

Што датычыцца нашай перапрацоўчай прамысловасці, то сёння мяса-малочная прадукцыя пастаўляецца ў 45 краін свету. Нашы прадпрыемствы прымаюць удзел у вядучых міжнародных выстаўках і кірмашах, дзе нязменна атрымліваюць узнагароды за якасць і новыя распрацоўкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**


Делаем вкусно с 1905 года

**Паважаныя працаўнікі сяла, работнікі перапрацоўчай прамысловасці, ветэраны сельскагаспадарчай вытворчасці!**

*Прыміце самыя сардэчныя віншаванні з нагоды прафесійнага свята — Дня работніка сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці!*

*Аграпрамысловы комплекс кардынальна адрозніваецца ад любой іншай галіны эканомікі тым, што вёска не толькі месца працы, але і месца жыхарства. Вёска — крыніца, з якой уся Беларусь чэрпае сілу жыцця.*

*Працавітасць, упартасць сельскіх працаўнікоў даюць рэальную аддачу: вёска адраджаецца, робяцца цяжкія, але ўпэўненыя крокі да паляпшэння жыцця.*

*Сёння можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што асновай паспяховага вырашэння далейшых задач аграпрамысловага комплексу з'яўляецца высокі прафесіяналізм, любоў і адданасць выбранай справе, вернасць слаўным традыцыям.*

*Нізкі паклон усім працаўнікам сяла, ветэранам, перадавікам вытворчасці за самаадданую працу і вернасць сялянскаму абавязку.*

*Магілёўскі мясакамбінат жадае Вам моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і новых працоўных поспехаў у імя працвітання роднай Беларусі!*

М 1905 МОГИЛЕВСКИЙ МЯСОКОМБИНАТ




УНП 700116386

# «АД ПОЛЯ ДА ПРЫЛАЎКА!»



**Работнікі сельскай гаспадаркі Прыдзвінскага краю шмат разоў даказвалі, што параўнальна цяжкія кліматычныя ўмовы не перашкаджаюць выконваць дзяржаўны заказ па здачы збожжавых і станоўча вырашаць іншыя задачы.**

Паводле слоў **старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама Сяргея ЯГОРАВА,** новы імпульс развіцця галіне надаў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 70 «Аб развіцці аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці» (ад 25 лютага 2020 года). Ён стаў алгарытмам для функцыянавання структур аграпрамысловага комплексу.

Створаны і актыўна набіраюць вытворчы тэмп сем буйных аграпрамысловых аб'яднанняў на базе: ААТ «Віцебскі мясакамбінат», ААТ «Аршанскі мясакансервавы камбінат», ААТ «Пастаўскі малочны завод», ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат», ААТ «Полацкі малочны камбінат», ААТ «Малако» (г. Віцебск), ААТ «Верхнядзвінскі масласырзавод». На іх долю прыпадае больш чым 50 % сельскагаспадарчай прадукцыі вобласці. Многае зроблена, каб сельскагаспадарчая галіна Прыдзвіння працавала па прынцыпе «ад поля да прылаўка».

**Старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Мікалай ШАРСНЁЎ,** які асабіста шмат зрабіў дзеля гэтага, упэўнены, што менавіта буйныя вытворцы здольныя канкурыраваць на ўнутраным і знешнім рынках. А стратныя гаспадаркі маюць магчымасць устаць пад крыло больш моцных.





Пры гэтым прадумана можна весці кадравую работу, акумулюруюцца фінансы для набыцця тэхнікі, паліва, угнаенняў, насення і іншага.

Дарэчы, у вобласці паэтапна арганізоўваецца вытворчасць уласнай сельскагаспадарчай тэхнікі, максімальна адаптаванай для складаных умоў рэгіёна.

Напрыклад, Ціраспальскім аграсэрвісам выраблялецца шыроказахопная гідрафікаваная барана, якая ў агрэгаце з энерганасычаным трактарам забяспечвае сутачную падрыхтоўку глебы плошчай 200 гектараў. За такімі магутнымі сродкамі апрацоўкі палёў будучыня.

Ёсць і іншыя прыклады вырабу і рамонту неабходнай тэхнікі на тэрыторыі вобласці. Нядаўна ў Верхнядзвінскім раёне прайшоў семінар-нарада па пытаннях падрыхтоўкі сельскагаспадарчых машын да веснавых палявых работ наступнага года. У ім брала ўдзел старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль Лiневіч, іншыя профільныя кіраўнікі розных узроўняў. Былі абмеркаваны новыя падыходы ў гэтай справе. На нарадзе прагучала лічба — 4 тысячы — амаль столькі адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі набыта за пяць апошніх гадоў.

Для таго каб сельскагаспадарчая галіна адпавядала патрэбам часу, расходуюцца буйныя сумы грошай.

Падчас мінулай пяцігодкі ў Віцебскай вобласці ўзведзена і поўнасцю рэканструявана чатырнаццаць ферм. За гэты час створана пяць тысяч месцаў для ўтрымання буйной рагатай жывёлы, 32 тысячы — для свіней, 132 тысячы — для птушкі.

З прымяненнем передавых ізраільскіх тэхналогій з нуля пад ключ узводзяцца найбуйнейшыя ў краіне свінагадоўчыя рэпрадуктары ў вёсцы Пушкі Лёзненскага раёна і паблізу вёскі Гараны Аршанскага раёна.

Сёлета абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2021» правялі ў Шуміліне (у наступным годзе свята прыме Глыбокае, праз год — Шаркаўшчына). Там па традыцыі падвялі вынікі чарговага жніва. Ураджай збожжавых склаў каля 780 тысяч пры сярэдняй ураджайнасці 25,5 цэнтнера з гектара. Гэты аб'ём дазволіў выканаць адпаведны дзяржаўны заказ.

На Віцебшчыне многае робіцца для замацавання кадраў на сяле. Ветэрынары і заатэхнікі, якія толькі пачынаюць кар'еру, атрымліваюць надбаўкі з абласнога бюджэту. У выніку Прыдзвінскі край вабіць выпускнікоў ВНУ аграрнага профілю, у моладзі з'яўляецца жаданне працаваць менавіта тут.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Харчовая бяспека

## СЕЛЬГАСАРГАНІЗАЦЫІ САБРАЛІ МІЛЬЁН ТОН БУЛЬБЫ

### Акрамя таго, у краіне заклалі павышаныя стабілізацыйныя фонды

**Сёлета аграрыі сабралі дастатковы ўраджай хлеба, калі ў цэлым было атрымана 9 мільёнаў тон збожжа. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН.**

Нягледзячы на засушлівае лета ў некаторых рэгіёнах краіны, цалкам выкананы дзяржаўны заказ па пастаўках збожжа, крупяных культур, рапсу і піваварнага ячменю. Практычна 1 мільён тон бульбы атрымана ў сельгасарганізацыях, а таксама — 631 тысяча тон гародніны, 170 тысяч тон пладоў. Гэты аб'ём дазваляе забяспечыць насельніцтва Беларусі плодаагароднінай прадукцыяй і мець экспартны патэнцыял. Сёлета стабілізацыйныя фонды павялічаны практычна ў два разы па ўсіх пазіцыях: бульбе, морквe, капусце, цыбулі і яблыках.

Дастаткова нядрэнна сёлета ідуць справы з травянымі кармамі. Іх ужо нарыхтавана 30 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы. «Гэта забяспечыць наша грамадскае пагалоўе жывёлы якасным кормам. А значыць, будзе і малако, і мяса», — адзначыў намеснік міністра.

«Сёлета ўжо зроблены задзел на ўраджай наступнага года. Пасеяна больш азімых збожжавых культур, узарана больш зябліва, назапашана больш угнаенняў. Усе гэтыя элементы ўплываюць на ўраджайнасць і дазволяць нам пачаць вясновую пасяўную без затрымак. У зімовы перыяд будзем рамантаваць сельскагаспадарчую тэхніку», — звярнуў увагу Уладзімір Гракун.

Падводзячы папярэднія вынікі сезона, аграрыі прагназуюць больш высокі экспарт харчавання, які па годзе можа перавысіць 6 мільярдаў долараў. Як заявіў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей БАГДАНАЎ**, калі захаваецца бягучая дынаміка, то мы прададзім за мяжу больш запланаванага.

Нагадаем, што летась было экспартавана прадуктаў харчавання на знешнія рынкі на 5,8 мільярда долараў. А ў 2025 годзе мы плануем падысці да лічбы ў 7 мільярдаў долараў. З улікам планаў па росце вытворчасці і высокай кан'юнктуры сусветнага рынку ў коштавым сегменце ў профільным міністэрстве лічаць, што гэтая лічба будзе дасягнута. «Асноўны трэнд гэтай пяцігодкі — павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці малака, мяса, раслінаводчай прадукцыі, а таксама паглыбленне перапрацоўкі. Гэта значыць будзе расці асартымент тавараў, якія пастаўляюцца на экспарт. У нас ёсць і стратэгія, і праграма па павелічэнні выхаду гатовай прадукцыі з 1 тоны сыравіны», — сказаў Аляксей Багданаў.

Па выніках 9 месяцаў года экспарт беларускага харчавання вырас на 12,6 % і перавысіў 4,7 мільярда долараў. Доля АПК у агульным кошыку беларускага экспарту склала практычна 17 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Працаўладкаванне

## Зарабіць на смартфон і не толькі

**За апошнія 9 месяцаў служба занятасці працаўладкавала амаль 30 тысяч навучэнцаў і студэнтаў, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Беларусі.**

У асноўным працаўладкаванне навучэнцаў і студэнтаў прыпадае на перыяд летніх канікулаў, аднак служба занятасці забяспечвае працай моладзь цэлы год: у вольны ад вучобы час маладыя людзі таксама могуць разлічваць на працаўладкаванне.

Для арганізацыі працоўнай занятасці моладзі ў вольны ад вучобы час у студзені — верасні 2021 года працаўладкавана амаль 30 тысяч навучэнцаў і студэнтаў. Пры гэтым за лета — каля 27 тысяч навучэнцаў і студэнтаў.

Працоўным заканадаўствам для вучняў і студэнтаў устаноўлена скарочаная працягласць рабочага дня. Так, у час летніх канікулаў у падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў яна не павінна перавышаць 4 гадзін 36 хвілін, а ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — 7 гадзін. У іншы вольны ад вучобы час для навучэнцаў і студэнтаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў гэта 2 гадзіны 18 хвілін, ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — 3 гадзіны 30 хвілін.

Маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў могуць выконваць толькі лёгкія віды работ, якія не з'яўляюцца шкоднымі для іх здароўя і развіцця, не перашкаджаюць атрыманню агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Сярод відаў работ, якія прапануюцца навучэнцам, пераважаюць рамонтныя работы ў школьных класах і навучальных аўдыторыях, добраўпарадкаванне навучальных устаноў і ўстаноў сацыяльнай абароны, пашыў швейных вырабаў, рэстаўрацыя кніжнага фонду бібліятэк, выраб мяккай цацкі і сувеніраў, стварэнне стэндаў і іншыя даступныя віды работ.

Студэнцкай моладзі ў асноўным прапануюць вакансіі камплектоўшчыка тавараў, прадаўца, супрацоўніка брыгады рэстарана, укладчыка-упакоўшчыка, афіцыянта, падсобнага рабочага і іншыя.

Для атрымання садзейнічання ў працаўладкаванні моладзі ў вольны ад вучобы час можна звярнуцца ў службу занятасці па месцы жыхарства і ва ўстанову адукацыі.

Інфармацыю аб арганізацыях, гатовых у вольны ад вучобы час прымаць на працу моладзь, можна ўдакладніць у рэгіянальных службах занятасці і на іх інфармацыйных рэсурсах, а таксама на інфармацыйным партале Дзяржаўнай службы занятасці http://gsz.gov.by/registration/ services/public/list/. Інфармацыя штотыдзень абнаўляецца.

Дарэчы, аб магчымасці забяспечыць часовую занятасць навучэнскай моладзі ў вольны ад вучобы час праінфармавалі 54 арганізацыі, якія гатовы прапанаваць для гэтых мэт каля 800 вакансій.

Мерапрыемствы па забеспячэнні занятасці моладзі ўключаны ў Дзяржаўную праграму «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» на 2021—2025 гады. На фінансаванне мерапрыемстваў у 2021 годзе прадугледжана каля 7 мільёнаў рублёў.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 41 (567)

# СПАТКАННЕ З КІНО НА ВЯЛІКІМ ЭКРАНЕ

**Чарговы раз XXVII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» збярэ прыхільнікаў кінамастацтва і яго стваральнікаў з 20 да 26 лістапада ў беларускай сталіцы. У гэтым годзе ён пройдзе пад дэвізам «Кіно — сімфонія адзінства», а насычаная праграма кінафоруму прадставіць публіцы ігравыя, дакументальныя фільмы, кінастужкі для моладзі і шэраг цікавых пазаконкурсных карцін.**

## ПРАЦЯГ З НОВЫМІ АКЦЭНТАМІ

Перш за ўсё прыемна адзначыць, што фестываль у абноўленым фармаце зноў вяртаецца ў культурную прастору. Сёлета ў яго змяніўся арганізатар, і цяпер кінафорум ладзіць Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм». Змяніліся таксама геаграфія, лагатып і прыз. Усяго дырэкцыя фестывалю атрымала 273 заяўкі з 54 краін, сярод якіх як даўнія сябры і кінапартнёры (Расія, Азербайджан, Грузія, Сербія, Украіна), так і краіны Лацінскай Амерыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі, Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Насуперак усім абставінам гісторыя «Лістапада» працягваецца, папаўняецца новымі падзеямі... Як адзначыў напярэдадні кінафестывалю **кінадраматург, сцэнарыст Канстанцін АНДРУШАЧКІН,** пакуль рана рабіць прагнозы адносна таго, як пройдзе фестываль, але «...патэнцыял у яго добры. Па-першае, кінематограф мае больш шырокую геаграфію, чым межы заходняга свету, па-другое, як аказалася, абноўлены «Лістапад» не проста не застаўся без еўрапейскага кіно, але і атрымаў больш гучныя заходнія рэлізы, чым назіраліся ў мінулыя гады, прычым не толькі па-за конкурсам, але і ў конкурсных праграмах».

Што да іншых навін, то ўжо дакладна можна канстатаваць адмену «Нацыянальнага конкурсу», але беларускае кіно аўдыторыя абавязкова ўбачыць. **Фільм «Страла» рэжысёра Галіны Адамовіч** прыме ўдзел у конкурснай праграме дакументальнага кіно. А «Лістападзік» адкрыецца паказам **поўнаметражнага анімацыйнага мюзікла Алены Туравай «Зоркі сёмага неба».** Кінастужка распавядае прыгодніцкую гісторыю пра дзяцей і дарослых, якія развучыліся глядзець на зоркі... У конкурснай праграме «Лістападзіка» таксама пакажуць два беларускія мультфільмы — **«Прэлюдыя і фуга» Ігара Волчака і «Я тайну ў глыбіні душы хаваю» Алены Пяткевіч** (якія адзначаны расійскай кінапрэміяй «Залаты арол»). Апошні расказвае пра Максіма Багдановіча і пра любоў да роднай мовы, культуры і творчасці. Іх мы ўбачым у палітры анімацыйных фільмаў з розных краін свету. У праграме конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі заяўлены **мультыплікацыйныя фільмы «Бу!» Рэгіны Сарбекавай (Расія), «Томі і львяня» Жолта Пальфі (Венгрыя), «Поўны рот вады» Сііма Раўда (Эстонія), «Вечнае полымя» Ву Дуй Канха (В'етнам), «Нават мышы трапляюць у рай» рэжысёраў Яна Бубенічка і Дэніза Грымава (Чэхія, Францыя, Славакія, Польшча)** і шэраг іншых.

**Фільмам адкрыцця «Лістападу» стане «Каралеўская гульня» Шчёльцля Філіпа (Германія, Аўстрыя)...** Асноўвай сюжэта стала «Шахматная навела» Стэфана Цвейга, дзеянне якой адбываецца ў Вене 1938 года. Юрыст Ёзэф Бартак разам з жонкай плануе пакінуць акупаваную нацыстамі Аўстрыю, але яго арыштоўвае гестапа. І пасля яго адмовы выдаць паліцыі канфідэнцыяльную інфармацыю пра кліентаў мужчыну пазбаўляюць сувязі са знешнім светам. Але аднойчы Ёзэфу ўдаецца здабыць кнігу пра шахматы, якая стала для яго і выратаваннем, і небяспечным насланнём... А да чаго



**«Каралеўская гульня» — фільм адкрыцця «Лістападу».**

прывядзе гэтая гульня чалавека з абставінамі, глядзіце на вялікім экране.

Увогуле, у праграме ігравога кіно адбудуцца паказы 13 фільмаў. Сярод іх — кінастужкі з Расіі, Францыі, Ірана, Узбекістана, Кітая, Венесуэлы і г. д. Так, будзе прадстаўлена кінааматарам **франка-іранская карціна Асгара Фархадзі «Герой»,** якая сёлета была адзначана Гран-пры журы Канскага фестывалю. А **фільм «Вуліца На Джазія (Кітай)** — магчымасць убачыць гісторыю Донгзі, які з-за хваробы бацькі стаў зборшчыкам даўгоў, каб выжыць. Жыццё на вуліцы, складаныя адносіны бацькоў і дзяцей і неадназначныя ўзаемадносіны з маладой жанчынай — усё гэта рэчаіснасць дваццацігадовага юнака, які шукае адказы і выхады з сітуацый. **Кінастужка «Дзень мёртвых»,** якую мінская публіка ўбачыць напрыканцы фестывалю, **расійскага рэжысёра Віктара Рыжакова** распавядае пра адносіны пакаленняў ужо зусім з іншых ракурсаў. Падарожжа сына і маці (Аляксандр Паль і Агрыпіна Сцяклова) да магіл продкаў ускрывае вялікі пласт тэм, эмоцыі і высноў як для саміх герояў, так і для гледача. Яшчэ ў праграме ігравога кіно ўбачым кінаработы **«Мая ноч» Антуанэты Була (Францыя, Бельгія), «Сем маленькіх супадзенняў» Петэра Готара (Венгрыя, Румынія), «Рака» Гасана Салаба (Ліван, Францыя, Катар, Германія), «Агонь» Айжан Касымбек (Казахстан)** і іншыя. На вялікім экране пакажуць **і ўзбекскую ваенную драму «Ілхак» Жахангіра Ахмедава,** знятую ў Беларусі.

## КІНО, ЯКОЕ ЎРАЖВАЕ І НЕ АДПУСКАЕ

Праграма конкурсу дакументальнага кіно таксама падабралася вельмі насычаная. Як адзначаюць арганізатары, хоць заявак было і не так шмат, як звычайна, але адбор рабілі амаль са 150 карцін-заявак. Паколькі «Лістапад» па часе свайго правядзення лічыцца «фестывалем фестываляў», то сярод іншага тут шукалі фільмы, якія раней удзельнічалі і былі высока адзначаны на іншых кінафорумах.

— Мы сфарміравалі праграму конкурсу дакументальнага кіно не толькі з тых фільмаў, што дасылалі нам, але і з канкрэтных карцін-прызёраў, якія і самі запрыкмецілі. Хоць у нас па рэгламенце павінна быць 12 карцін з 10 краін, але я папрасіў пашырыць гэтыя рамкі да 17, таму што шкада было губляць добрыя фільмы альбо аддаваць іх на пазаконкурсную праграму, — распавядае **праграмны дырэктар конкурсу дакументальнага кіно ММК «Лістапад» Сяргей КАЦЬЕР.** — Вызначаць найлепшых будзе міжнароднае журы, але мне яны ўсе падабаюцца. Фільмы зроблены якасна, прафесійна і маюць мастацкі складнік, таму па сваім узроўні не саступаюць ігравому кіно і яго найлепшым узорам. Тут адабраны карціны, у якіх спалучаюцца выдатная драматургія, рэжысура і аператарская праца. І, што самае галоўнае, пасля іх прагляду застаецца прыемны смак. Гэтае кіно прымушае вас думаць, суперажываць і працяглы час не адпускае. Тэмы, якія закранаюцца ў кожнай кінастужцы, не імгненныя, а агульначалавечыя і пазачасавыя, таму што суправаджаюць нас па жыцці. Любоў, смерць, адзінота, сяброўства, павага да бліжняга (як бы ні адрозніваліся вашы погляды на нешта), узаемаадносіны пакаленняў і жаданне разабрацца ў самім сабе і знайсці сваё месца ў гэтай рэчаіснасці — вось асноўныя напрамкі таго, што знайшло адлюстраванне ў гэтых дакументальных фільмах.

Для нагляднасці прапаную пазнаёміцца з некаторымі сюжэтамі кінастужак. **Уругвайска-італьянскі фільм «Боска» Аліцыі Кано Меноні** пазнаёміць нас з сямейным партрэтам праз калектыўныя ўспаміны, любоў і смутак. Дзед Арланда некалі эмігрыраваў ва Уругвай з італьянскай вёскі Боска, а потым распавядаў пра гэтае месца сваёй унучцы. І Аліцыя, рэжысёр кінастужкі, адправілася ўбачыць тыя мясціны, пра якія ёй так прыгожа расказвалі... А вось **«Кадакушы» Янзара Алтая (Турцыя)** — фільм, які ўдастоіўся шэрагу міжнародных узнагарод, з'яўляецца аповедам пра адзіноту і яе адценні. Нарахіта працуе ў кампаніі, якая спецыялізуецца на прыбіранні кватэр нядаўна памерлых людзей. Адзінокія смерці, з якімі ён сутыкаецца, падштурхоўваюць яго да асэнсавання ўласнай сямейнай траўмы. Аднак усё не так проста, як можа здавацца. Калі ж звернемся да зместу дакументальнай кінаработы **«Спяцы» расійскага рэжысёра Ганны Драніцыйнай,** то даведаемся гісторыю пра дзяцей і іх выхавальнікаў са спецшколы для цяжкіх падлеткаў. Яны спатыкаліся і памыляліся ў жыцці, таму цяпер знаходзяцца ў школе закрытага тыпу і вучацца жыць па-іншаму. Гэтае чорна-белае кіно яскрава ілюструе рэальнасць герояў, у якой не так проста знайсці сілы і веру, каб убачыць і іншыя колеры. Фарбаў у палітры праграмы дакументальнага кіно сёлета шмат. Акрамя ўжо згаданых, увазе гледача будуць прадстаўлены кінастужкі **«Я вольны» Лауры Парцьер (Францыя, Бельгія), «Роварам да Месяца» Георгія Харэбава (Грузія), «Ціхая спадчына» Пеці Накавай (Балгарыя)** і г. д.

## НОВЫЯ ПОГЛЯДЫ І ЧАКАНЫЯ ПРЭМ'ЕРЫ

«Кіно маладых» — гэта конкурсная праграма, у якую сёлета трапіла больш чым 20 кінастужак. Геаграфія прадстаўленых фільмаў ахапіла Францыю, Чэхію, Кубу, Расію, Аўстралію, Індыю, Кітай... Мы ўбачым **«Дарогу» беларускага рэжысёра Кірыла Халецкага, «Што мы бачым, калі глядзім на неба?» Аляксандра Каберыдзэ (Германія), «Нявінна сіні» Сяояй Ню (Кітай), «Маякоўскі» Вікторыі Няфёдавай (Расія), «Сын» Нушына Міранджы (Іран)** і шэраг іншых цікавых работ. Так, **швейцарскі фільм «Дзяўчына і павук»** братоў Рамона і Сільвана Цюрхераў знаёміць з рэжысёрскім поглядам на сумеснае пражыванне людзей, гісторыяй іх узаемаадносін, канфліктаў, што дае магчымасць рэфлексаваць і спазнаваць сябе.

У праграме пазаконкурснага кіно таксама ёсць з чаго выбіраць. Тэматычны блок «Беларуская анімацыя XXI стагоддзя» прадэманструе мультыплікацыйныя фільмы **«Паданне пра Гадзіву» Ірыны Кадзюковай, «Беларускія прымаўкі» Міхаіла Тумелі, «Дзед» Аляксандра Ленкіна, «Лыжка для салдата» Ірыны Тарасавай, «Паданне пра гуслі» Таццяны Кубліцкай, «Цацка» Рыты Шаграй, «Лагодны воўк» Наталлі Дарвінай,** якія варта глядзець і абмяркоўваць усёй сям'ёй. Акрамя гэтага, гледачоў чакаюць рэтраспектыва грузінскага кіно, паказ ваеннай драмы **Віктара Турава «Праз могілкі»,** высокарэйтынгавага **франка-бельгійскага дэтэктыўнага трылера «Чорная скрыня».** І ўбачым нават сёлетняга пераможцу Берлінскага фестывалю — фільм **«Вар'яцкае кіно для дарослых» Раду Жудэ.** Пакажуць і чаканы многімі фільм **«Залатыя суседзі»,** у акцёрскім складзе якога задзейнічаны Міхаіл Баярскі, Святлана Немаляева, Сяргей Шнураў, Іван Ахлабысцін і іншыя вядомыя артысты расійскага кінематографа. Варта не абмінуць увагай і **кінаработу Аляксея Казлова «Сумленне» (Расія),** што была адзначана ў гэтым годзе на Шанхайскім кінафестывалі. Дзеянне фільма адбываецца ў Петраградзе ў 1920-я гады. У цэнтры гісторыі — следчы Барыс Летуш, які не можа больш трываць беззаконне. І вось калі забіваюць яго брата, то ён пачынае ўласнае расследаванне, але ў ім герою давядзецца пайсці супраць самога сябе.

Гучна анансавалі і пазаконкурсны паказ дакументальнага праекта **«Qazaq. Гісторыя залатога чалавека» рэжысёра Ігара Лапаценкі,** які базіруецца на інтэрв'ю амерыканскага рэжысёра Олівера Стоўна (ён у фільме выступіў яшчэ і ў якасці выканаўчага прадзюсара) з першым прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Прэзентавалі работу на Рымскім кінафестывалі, і вось зусім хутка і беларуская публіка зможа ўбачыць фільм на вялікім экране. У цэлым больш за трыццаць фільмаў трапіла ў пазаконкурсную праграму, таму кожны пры жаданні знойдзе штосьці цікавае для сябе.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Встречайте праздники

**1. Организатор и заинтересованное лицо рекламной игры.**

Организатор рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «Минт филд» (далее именуемое «Организатор»), зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192465627, свидетельство о государственной регистрации выдано 16.02.2016 г.

Местонахождение Организатора: 220052, г. Минск, ул. Гурского, д. 37, пом. 5Н, комн. 5н-5/6.

Заинтересованное лицо рекламной игры: ИООО «АЛИДИ-Вест», зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 7 октября 2011 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191688253.

Местонахождение заинтересованного лица: 220140, г. Минск, ул. Домбровская, д. 9, оф. 7.3.1.

**2. Наименование рекламной игры –** «Встречайте праздники с Gillette!».

**3. Территория проведения –** Республика Беларусь. Приобрести Игровой товар можно в любых объектах розничной торговли на территории Республики Беларусь, реализующих Игровой товар, в любых интернет-магазинах, зарегистрированных в Торговом реестре Республики Беларусь, реализующих Игровой товар.

**4. Срок проведения рекламной игры –** с 21.11.2021 г. по 13.05.2022 г. (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:**

председатель:

Николаева Ирина Анатольевна, общество с ограниченной ответственностью «Минт филд», директор.

Члены комиссии:

Бука Светлана Анатольевна, общество с ограниченной ответственностью «Минт филд», ведущий специалист по маркетингу;

Королева Валерия Игоревна, общество с ограниченной ответственностью «Минт филд», дизайнер;

Каледа Юлия Николаевна, индивидуальный предприниматель;

Сташкевич Алла Геннадьевна, иностранное общество с ограниченной ответственностью «АЛИДИ-Вест», менеджер по рекламе.

**6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра:**

рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующих товаров (далее по тексту Правил – Игровой товар):

| № п/п | Штрих-код | Наименование товара |
|---|---|---|
| 1 | 7702018483198 | ПН GILLETTE FUSION Бритва с 1 сменной кассетой и Гель для бритья для чувствительной кожи 75 мл |
| 2 | 7702018508303 | ПН GILLETTE MACH3 Start Бритва с 1 сменной кассетой и TGS Пена для бритья Sensitive Skin (для чувствительной кожи) с алоэ 100 мл |
| 3 | 7702018508549 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Flexball Бритва с 1 сменной кассетой и GILLETTE FUSION Гель для бритья Hydra Gel Sensitive Skin (для чувствительной кожи) 75 мл |
| 4 | 7702018509331 | ПН GILLETTE FUSION Гель для бритья Hydra Gel Sensitive Skin (для чувствительной кожи) 200 мл и GILLETTE Pro Бальзам после бритья 3в1 Мгновенное увлажнение SPF+15 50 мл |
| 5 | 7702018529445 | ПН GILLETTE TGS Пена для бритья Sensitive Skin (для чувствительной кожи) с алоэ 250 мл и OLD SPICE Гель для душа WhiteWater 250 мл |
| 6 | 7702018529469 | ПН GILLETTE TGS Пена для бритья Sensitive Skin (для чувствительной кожи) с алоэ 100 мл и Гель после бритья Sensitive Skin (для чувствительной кожи) 75 мл |
| 7 | 7702018530168 | ПН Gillette Mach 3 Start бритва с одной кассетой и Gillette Series пена для чувствительной кожи 100 мл и Head&Shoulders шампунь Основной уход 90 мл в дорожной косметичке |
| 8 | 7702018530243 | ПН GILLETTE VENUS Snap Embrace Компактная бритва с 1 сменной кассетой в подарочной упаковке |
| 9 | 7702018556946 | ПН GILLETTE SKINGUARD Sensitive Пена д/бритья д/чувствительной кожи с экстрактом Алоэ ЗащитаКожи 250мл и GILLETTE Бальзам после бритья Sensitive Skin (для чувствительной кожи) 75 мл |
| 10 | 7702018556960 | ПН GILLETTE TGS Пена для бритья SensitiveSkin (для чувствительной кожи) с алоэ 250 мл и Спортивное полотенце |
| 11 | 7702018556984 | ПН GILLETTE TGS Гель для бритья Sensitive Skin (для чувствительной кожи) с алоэ 200 мл и Галстук-бабочка |
| 12 | 7702018560288 | ПН GILLETTE SKINGUARD Sensitive Бритва с 1 сменной кассетой и GILLETTE SKINGUARD Sensitive Пена д/бритья д/чувствительной кожи с экстрактом Алоэ ЗащитаКожи 250 мл |
| 13 | 7702018560301 | ПН GILLETTE SKINGUARD Sensitive Бритва с 2 сменными кассетами и Дорожный чехол для бритвы |
| 14 | 7702018560325 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Styler Стайлер с 1 смен. кас. Power + 3 насадки д/моделирования бороды/усов и GILLETTE FUSION ProGlide Power Сменные кассеты для бритья 2 шт. и Эксклюзивная сумочка-чехол для стайлера в Металлической подарочной коробке |
| 15 | 7702018560363 | ПН GILLETTE VENUS Бритва с 1 сменной кассетой и Дорожный чехол для бритвы |
| 16 | 7702018560387 | ПН GILLETTE VENUS ComfortGlide Breeze Бритва с 2 смен. кассетами (со встроен полосками с гелем для бритья) и Дорожный чехол для бритвы |
| 17 | 7702018560400 | ПН GILLETTE VENUS Extra Smooth Sensitive Rosegold Бритва с 2 сменными кассетами в дорожной косметичке |
| 18 | 7702018565061 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Flexball Бритва с 2 сменными кассетами и Дорожный футляр для бритвы |
| 19 | 7702018565085 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Flexball Бритва с 2 сменными кассетами, дорожным чехлом в металлической подарочной коробке |
| 20 | 7702018565108 | ПН GILLETTE MACH3 Start Бритва с 1 сменной кассетой и GILLETTE MACH3 Гель для бритья Экстракомфорт 75 мл |
| 21 | 7702018565122 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Power Бритва с 1 сменной кассетой (с элементом питания) с Моделью гоночного автомобиля Lamborgini в эксклюзивном дизайне POWER RED |
| 22 | 7702018565146 | ПН GILLETTE MACH3 Бритва с 1 сменной кассетой и Дорожный чехол для бритвы в подарочной упаковке |
| 23 | 7702018565160 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Flexball Бритва с 2 сменными кассетами и GIL FUSION Гель д/бр д/чувств кожи 200 мл в металлической подарочной коробке |
| 24 | 7702018565184 | ПН GILLETTE FUSION Бритва с 1 сменной кассетой и Дорожный чехол для бритвы |
| 25 | 7702018565207 | ПН GILLETTE MACH3 Бритва с 1 сменной кассетой и GILLETTE MACH3 Сменные кассеты для бритья 2 шт. и Дорожный чехол для бритвы |
| 26 | 7702018565238 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Flexball Бритва с 1 сменной кассетой в эксклюзивном дизайне бритвы CHROME с дорожным чехлом в подарочной упаковке |
| 27 | 7702018565252 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Flexball Бритва с 1 сменной кассетой и GILLETTE FUSION ProGlide Сменные кассеты для бритья 2 шт. в подарочной упаковке в эксклюзивном премиальном дизайне бритвы CHROME с подставкой для бритвы |
| 28 | 7702018565276 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Power Бритва с 1 сменной кассетой (с элементом питания) и GILLETTE FUSION ProGlide Power Сменные кассеты для бритья 4 шт. с эксклюзивной премиальной металлической подставкой для бритвы |
| 29 | 7702018565290 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Flexball Бритва с 1 сменной кассетой и GILLETTE FUSION ProGlide Сменные кассеты для бритья 4 шт. в Премиальной подарочной упаковке в эксклюзивном премиальном дизайне бритвы CHROME с подставкой для бритвы |
| 30 | 7702018565863 | ПН GILLETTE FUSION ProGlide Flexball Бритва с 1 сменной кассетой и GILLETTE FUSION ProGlide Сменные кассеты для бритья 2 шт. в Премиальной дорожной косметичке с Дорожным чехлом для бритвы |
| 31 | 7702018566662 | ПН GILLETTE VENUS Бритва с 1 сменной кассетой и SATIN CARE Гель для бритья для женщин для чувствительной кожи с Алоэ 75 мл |
| 32 | 7702018581788 | ПН GILLETTE MACH3 Turbo Бритва с 1 сменной кассетой Red и GILLETTE MACH3 Гель для бритья Экстракомфорт 75 мл |
| 33 | 7702018611966 | ПН GILLETTE MACH3 Бритва с 1 сменной кассетой и гель для бритья для чувствительной кожи 100 мл |
| 34 | 7702018611980 | ПН GILLETTE FUSION Proglide бритва с 2 сменными кассетами, гель для бритья 200 мл и чехол |
| 35 | 7702018612000 | ПН GILLETTE MACH3 Бритва с 1 сменной кассетой, гель для бритья для чувствительной кожи 75 мл и чехол |
| 36 | 7702018612031 | ПН GILLETTE MACH3 Бритва с 2 сменными кассетами и гель для бритья для чувствительной кожи 200 мл |
| 37 | 7702018613328 | ПН GILLETTE FUSION Бритва с 3 сменными кассетами гель для бритья для чувствительной кожи 75 мл и подставка |
| 38 | 7702018613342 | ПН GILLETTE FUSION Proglide Бритва с 1 сменной кассетой и гель для бритья для чувствительной кожи 200 мл |
| 39 | 7702018613366 | ПН GIL VENUS Бритва с 2 сменными кассетами с витамином Е и косметичка |
| 40 | 7702018614110 | ПН GILLETTE FUSION Бритва с 1 сменной кассетой, гель для бритья для чувствительной кожи 200 мл и чехол |
| 41 | 7702018614134 | ПН GILLETTE MACH3 Бритва с 1 сменной кассетой, гель для бритья для чувствительной кожи 100 мл, шампунь Head & Shaulders основной уход 90 мл |
| 42 | 7702018615094 | ПН KING C. GILLETTE бритва для контуринга и 15 лезвий для бритья и гель для бритья 150 мл |
| 43 | 8006540495629 | ПН KING C. GILLETTE, бальзам 100 мл и средство для очищения 350 мл |
| 44 | 8001090965882 | ПН GILLETTE пена для бритья 250 мл, гелевый дезодорант 75 мл |

**7. Условия участия и порядок отбора участников рекламной игры.**

7.1. К участию в рекламной игре допускаются граждане, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет. Под гражданами для целей настоящих Правил понимаются граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, выполнившие условия участия в рекламной игре.

Участниками рекламной игры не могут быть члены Комиссии, а также лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, их супруги, их близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства.

7.2. Для участия в рекламной игре потребитель должен в период с 21 ноября 2021 года по 14 апреля 2022 года включительно:

7.2.1. совершить покупку одного или нескольких – Игрового товара (-ов), указанного (-ых) в п. 6 Правил, и сохранить чек, подтверждающий покупку;

7.2.2. в период с 21.11.2021 г. по 14.04.2022 г. (включительно) пройти по ссылке www.gillette-promo.by (далее – Интернет-сайт), заполнив регистрационную форму, достоверно указав свои персональные данные:

- фамилия, имя (обязательно), отчество (при наличии);
- почтовый адрес для корреспонденции (обязательно);
- номер мобильного телефона участника в международном формате и название оператора (А1, МТС, life) (обязательно);
- адрес электронной почты (обязательно);
- подтверждение изучения правил рекламной игры и согласия на участие в рекламной игре (обязательно);
- наименование торгового объекта или интернет-магазина, зарегистрированного в Торговом реестре Республики Беларусь, в котором приобретен Игровой товар (обязательно);
- наименование приобретенного Игрового товара (обязательно);
- стоимость приобретенного Игрового товара (обязательно);
- номер кассового (товарного) чека (обязательно);
- дата совершения покупки (обязательно);
- дата регистрации заявки на участие в рекламной игре (обязательно).

Кроме того, в регистрационной форме содержится поле, где необходимо обязательно загрузить фотографию кассового (товарного) чека, подтверждающего покупку Игрового товара, указанного в п. 6 Правил, изображение которого должно быть четким и содержать:

- дату приобретения Игрового товара;
- номер кассового (товарного) чека;
- наименование Игрового товара.

Под кассовым (товарным) чеком (далее – чек) в настоящих Правилах понимается документ, подтверждающий факт приобретения Игрового товара, который должен содержать сведения об УНП (учетном номере плательщика) продавца, дате продажи, наименовании, количестве и цене приобретенного Игрового товара, указанного в п.6 Правил. Все данные в чеке должны быть читабельны. Изображение чека должно быть четким и читабельным. Тип файла: JPEG, JPG, размер не более 5 Мб, разрешение не менее 200 (двести) dpi. Не допускаются изображения, не являющиеся фотографиями (скриншоты, оттиски, картинки, компьютерная графика, фотомонтаж). Чек должен быть сфотографирован полностью, включая верхний и нижний край чека, изображение чека должно быть строго вертикально ориентированным. Фотографировать чек необходимо под прямым углом. Загруженные чеки проходят проверку на соответствие условиям рекламной игры (модерацию) в течение 72 часов с момента их загрузки.

Кассовые (товарные) чеки без наименования Игрового товара не могут быть использованы для участия в рекламной игре.

7.3. Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.) автоматически по порядку.

Под Игровым кодом в настоящих Правилах понимается цифровой уникальный семизначный код, который присваивается по правилам, указанным в п. 7.4 и 7.5 настоящих Правил.

7.4. Участник получает один Игровой код за каждые 13,00 (тринадцать) белорусских рублей 00 копеек в чеке, потраченные на покупку Игровых товаров при покупке их в объектах розничной торговли на территории Республики Беларусь или в интернет-магазинах, зарегистрированных в Торговом реестре Республики Беларусь (например, за покупку Игровых товаров на сумму 75,00 (семьдесят пять) белорусских рублей в чеке участник получает пять Игровых кодов).

7.5. Каждому покупателю, который впервые совершил действия, указанные в пп. 7.2.1 и пп. 7.2.2 п. 7.2 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного Игровой код на дату и время заполнения регистрационной формы на Интернет-сайте.

7.6. Каждому покупателю, который совершил повторные действия по регистрации чека на Интернет-сайте, согласно п. 7.2.2 Правил (и который прошел прежде регистрацию на Интернет-сайте, согласно пп. 7.2.2 п. 7.2), присваивается следующий после последнего присвоенного Игровой код на дату и время заполнения регистрационной формы на Интернет-сайте.

